Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэй пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок пашпарэй пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок пашпарэй перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьлепцыя на 50 проц. дарожэй.

Зьмін тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 мак.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыя ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 250 (2739) Чацьвер, 31-га кастрычніка 1929 г.

Савецкая Беларусь" ... 3, государ-... библиотека

Дакумант бяздарнай хлусьні

...орадавая „Правды“ абмяркоўваю... дэклярацыю нанкінскага ўраду, пі... «Нанкінскі ўрад агаласіў дэкляра..., якая зьяўляецца самым яскра... узорам трусьлівага перапуджана... ясьсільля і самай подлай няшчы...ці.

...анкінскія кіраўнікі памыкаюцца ...ваць сябе, як няўтомных міра...цаў, якія бяз посьпеху імкнуцца ...ваканаць СССР згадзіцца на прыя...скае ўнарадкаваньне канфлікту», ...лікшага, як вядома, у выніку бяс...кладна разбойніцкага налёту, які ...адняецца да гэтага часу нячува...і па сваёй суровасьці праследа...ньнямі савецкіх грамадзян, наскокамі ...савецкую тэрыторыю белагвардзей...банд і далейшымі захопамі мае...ці савецкіх грамадзян (нядаўні за...сум і маемасьці ліквідацыйнай ...ісіі Дальбанку).

...алі ў ледзь дыхаючага нанкінскага ...ду, які фактычна кіруе толькі ...ума-трыма правінцыямі і вытрым...е суровы націск шматлікіх уну...ных ворагаў, і дадалося за апошні ...ваяўнічай рызыкі і гонару, дык ...асьці і бессаромнасьці—галоўных ...сьцяў кітайскіх мілітарыстаў—у ...засталося яшчэ даволі, і яго апош...дэклярацыя зьяўляецца ў гэтым ...ым выразным доказам.

...ерад наяўнасьцю вядомых усяму ...ту фактаў, дакументаваных у афі...най перапісцы, якая вялася праз ...ецкі ўрад, і сваячана поўнасьцю ...і агалошаных, Нанкін адважваецца ...сваю вэрсію перамоў, якая нічо...супольнага з сапраўднасьцю ня мае ...ведчыць толькі аб выключнай ...умнасьці і недальнабачнасьці яе ...цаў».

...апомніўшы далей пра ўвесь ход ...віцьця дыпляматычнага канфлікту, ...авда» піша: «Усім вядомыя, шы...а агалошаныя факты не перашко...і нанкінскаму ўраду выступіць з ...увана пераблытанай вэрсіяй пера..., якая самым наглым чынам пера...твае і перакручвае ўсе факты: Нанкін завярае, што перамовы ў Ман...рыі ўзьніклі па просьбе савецкага ...ду, які сарваў гэтыя перамовы, Нанкінскі ўрад адважваецца перад ...ўнасьцю дакументальных і агалоша...даных заяўляць, што праэкт су...льнай дэклярацыі быў прапанаваны ...одным баком“ нямецкім урадам, ...загадзя пагадзіў яго з савецкім ...дам і Нанкінам, 3) Нанкін ізноў ...тарае тады-ж выкрытую намі пе...рымку нашага адказу на нанкін...ю прапанову, завяраючы, што мы ...рабавалі ўставіць слова „неадклад...“ перад словам „раіць“, у той час як мы на справе патрабавалі неад...кладна назначыць кіраўніка УК чы...гункі, 4) але самае цікавае і пікант...нае будзе далей.

Нанкін бярэцца завяраць, спасыла...ючыся на нямецкі ўрад, што і пасьля нашага адказу ад 17-га верасьня пе...рамовы прадаўжаліся, прычым Нямеччына зьяўлялася „трэцім бокам“, праз які гэтыя перамовы праводзіліся. І гэ...та не зважаючы на тое, што, як ужо вышей зазначалася, савецкі ўрад ня раз адхіляў нанкінскія злосныя выдум...кі аб гэтых перамовах, 5) Нанкін да...лей заяўляе, што, выкарыстаўшы ня...мецкія перамовы ад 9-га кастрычніка аб узаемным вызваленьні арыштаваных, нанкінскі ўрад ізноў заявіў аб сваім жаданьні падпісаць дэкларацыю, уключаючую, як вядома, і пункт аб вызваленьні арыштаваных. Агаварым...ся, што калі-б такая прапанова і была зроблена Нанкінам, дык яна, бяс...спрэчна, была-б адхілена, бо гэты праэкт дэклярацыі можа быць намі прыняты толькі ў выпадку прыняцьця і нашых паправак да праэкту. Але цікавей за ўсё тое, што нікому аб та...кой прапанове невядома.

Такім зьяўляецца кароткі пералік чарговых падлогаў нанкінскіх палі...тыканаў, падлогаў, якія ў дастатковай меры пацьвярджаюць абсалютную пра...вільнасьць меўшага ў свой час агала...шэньня ў перапісцы з Нанкінам, чые намеры і недабрасумленнасьць былі нам у поўнай меры зразумелы і тады.

Рэдкі ў сваім родзе па выключнай бессаромнасьці дакумант нанкінскага ўраду прызначаецца, у першую чаргу, для ўнутранага ўжываньня. Але гэтая дэклярацыя азначае таксама новую спробу Нанкіна апэляваць да дзяржаў з мэтаю выклікаць міжнароднае ўмя...шаньне. Няма ніякага сумненьня ў тым, што Нанкін згадзіўся-б лепш на любую форму чужаземнага ўмешаньня, чымся на непасрэдныя перамовы Мук...дэну з савецкім урадам. Гэта новая спроба выклікаць выступленьне дзяр...жаў, будзе мець такія-ж вынікі, як і ўсе, праваленыя ўжо ў педалёкім мі...нулым гэткія-ж спробы, і толькі лішні раз выявіць сапраўдныя пляны і намеры Нанкіну.

Працоўныя масы Савецкага Саюзу, як і раней, перапоўнены цьвёрдай ра...шучасьцю абараніць свае інтарэсы і яны не сумняваюцца, што цьвёрдая, рашучая палітыка савецкага ўраду, якая застаецца нязьменнаю на працягу ўсяго канфлікту, зьяўляецца на...дзейнай гарантыяй таго, што інтарэ...сы Савецкага Саюзу будуць поўнасьцю забясьпечаны“.

Дэклярацыя Нанкіну аб савецка-кітайскім канфлікце.

Пералік чарговых падлогаў нанкінскіх палітыканаў.

...НАНХАЙ, 25-X. Нанкінскае міні...рства замежных спраў агаласіла ...лярацыю, прысьвечаную савецка-...айскаму канфлікту.

Дэклярацыя пачынаецца з паўта...ньня старых нанкінскіх выдумак аб ...ычынах захопу чыгункі, пасьля ча...яна пераходзіць да меўшым месца ...обам упарадкаваць канфлікт шля...м згоды. Дэклярацыя завяраe, што ...льнікаў заявіў аб гатоўнасьці рас...цаць перамовы, пасьля чаго нацыя...льны ўрад даручыў Чу-Шао-Яну ...ткацца на станцыі Манчжурыя з са...кім прадстаўніком. Аднак СССР не ...значыў свайго прадстаўніка.

„Савецкі пасол у Нямеччыне,—за...чана далей у дэклярацыі,—выка...ў жаданьне распачаць перамовы. ...меччына прапанавала наступную ...рмулу, якая павінна была выявіцца ... выглядзе супольнай дэклярацыі“ ...лей ідзе вымест кітайскай прапано..., агалошанай у савецкім друку ...-га жніўня). 27-га жніўня гэтая ...рмула была афіцыйна прапанавана ...ведзьвом дзяржавам. СССР узяў на...ц сваю ранейшую згоду і адмовіўся ...ыняць формулу, дамагаючыся таго, ...б слова „новага“ было выкасавана, ... перад словам «раіць» пастаўлена ...ова „неадкладна“, пры гэтым СССР ...яўляў, што новы кіраўнік УК чы...нкі павінен быць назначан адна...сна з агалашэньнем супольнай дэклярацыі, і што абодвы ўрады ...авінны інструктаваць сваіх грамадзян ... выкананьні арт 6 згоды 1924 г.

Нацыянальны ўрад, прыняўшы да ...дама парушэньне даверя з боку ...ССР, адказаў наступнае (далей ідзе ...мест кітайскай заявы 9 верасьня, ...галошанай у савецкім друку 14 ве...сьня).

СССР адмовіўся пайсьці на ўступкі, ...ляючы, што адмова нацыянальна... Ураду згадзіцца на прыняцьце са...вецкіх контр-прапаноў азначае, што Кітай бярэ назад сваю ўласную згоду і свае пачатковыя прапановы, рашаю...шы наогул адмовіцца ад упарадкаваньня канфлікту. Не зважаючы на тое, што яго нясупынныя імкненьні паміры...цца ня раз сустракалі вострый адпор, нацыянальны ўрад шукаў кожны раз здаровага і разумнага шляху для дасягненьня згоды.

9 кастрычніка, атрымаўшы ад Нямеччыны прапанову аб узаемным абмене зьняволенымі, нацыянальны ўрад падкрэсьліў, што такая прапанова прадугледжана супольнай дэклярацы...яй, а значыць, магла-б быць ажыцьцёўлена адначасна з агалашэньнем супольнай дэклярацыі пры меркаваньні, што СССР дзейнічае шчыра. Пасьля гэтага Нямеччына садзейнічала таму, каб прапанаваная супольная дэклярацыя была перагледжана для ўключэньня ў яе пастановы на карысьць абаюднага назначэньня дэлегатаў, упарадкаваньня нявырашаных пытаньняў, упарадкаваньня ўмоў, якія пануюць на Ў.-К. чыгунцы, узаемнага абмену зьняволенымі і спыненьня ваенных перасовак уздоўж мяжы.

Аднак, СССР афіцыйна адхіліў нямецкую прапанову аб абмене зьняволенымі на той падставе, што Кітай намеран паважаць угаворныя абавязацельствы“.

Дэклярацыя мае ў канцы спасылку на няіснаваўшыя шматлікія акты нападу, учыненыя СССР на кітайскай тэрыторыі ў той самы час, калі адказныя прадстаўнікі абодвых бакоў радзяцца з трэцім, імкнучыся дасягнуць згоды. Нанкінскі ўрад заяўляе, што ён лічыць СССР адказным за ўсе страты, учыненыя жыцьцю і маемасьці кітайцаў і за магчымае парушэньне міру на Далёкім Усходзе.

Замежныя дэлегацыі на Кастрычнікавыя ўрачыстасьці.

РЭВЕЛЬ, 28-X. Да 12-х угодак Кастрычнікавай рэвалюцыі ў СССР накіроўваецца дэлегацыя прадстаўнікоў нога крыла эстонскага прафруху ў складзе 24-х асоб.

НЬЮ-ЁРК, 23-X. Для ўдзелу ў Кастрычнікавых урачыстасьцях у СССР ...ежджае амэрыканская рабочая дэле...цыя з 25-ці рабочых і фэрмэраў.

Угавор паміж Польшчай і Румыніяй.

ВЕНА, 26-X. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, учора ў Бухарэст прыехаў польскі міністр замежных спраў Залескі, які падпісаў угавор з Румыніяй аб арбітражы і пагоджваючым разборы. Тэрмін угавору —5 гадоў.

Шпаркім крокам да поўнай пабудовы сацыялізму

Працяг гутаркі тав. ЧАРВЯКОВА з дэмабілізаванымі чырвона армейцамі.

БОЛЬШ УЦЯГНУЦЬ СРОДКІ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў БУДАЎНІЦТВА.

Недахоп тавараў адчуваецца і ў горадзе і на вёсцы. Але чым тлумачыцца гэты недахоп тавараў. Кулак гаворыць, што недахоп тавараў тлумачыцца тым, што ўся гаспадарка Савецкага Саюзу ідзе ў „трубу“. Гэта значыць, што ў нас усё зьнішчаецца, што ў нас усё руйнуецца, усё робіцца горш і горш.

Перш за ўсё ці павялічваецца агульны лік тавараў? Мне думаецца, што на прыкладзе працы бліжэйшай кааперацыі кожны можа даказаць, што агульны лік тавараў з кожным годам у нас павялічваецца. Павялічваецца лік фабрык і заводаў, што вырабляюць гэтыя тавары. Ідзе пашырэньне вытворчасьці тых фабрык, што ўжо існавалі, якія былі намі адноўлены. Павялічваецца прадукцыйнасьць працы. Мы перайшлі на бесперапынны тыдзень, павялічваем лік рабочых, пераходзім на 3-хзьменную працу. Усё гэта разам узятае павялічвае ў некалькі разоў лік тавараў у параўнаньні з мінулымі гадамі. Аднак, тавараў не хапае, чаму? Таму, што патрэбы на гэтыя тавары і магчымасьці купляць гэтыя тавары з кожным годам яшчэ больш павялічваюцца.

Рост вырабу ў нас не пасьпявае за ростам тых запатрабаваньняў, якія растуць у нашай краіне.

Кулак плача аб прыватным гандляру. Ён гаворыць, што калі быў прыватны гандляр, дык хоць і дорага былі тавары, але можна было купіць, а ў сучасны момант і дорага і няма дзе купіць. Калі існаваў прыватны гандляр, дык гэты прыватны гандляр пры эдсутнасьці ў кааперацыі гэтых тавараў прадаваў дорага. Гэтыя дарагія тавары купляў у прыватнага гандляра той, хто мог заплаціць дорага. Бядняк ня купляў. У сучасны момант бядняк і серадняк мае магчымасьць купляць.

Значыцца, у нас тавараў у кааперацыі не хапае таму, што вытворчасьць тавараў не пасьпявае за ростам запатрабаваньняў насельніцтва і ростам магчымасьцяў насельніцтва купляць гэтыя тавары. Каб задаволіць патрэбы насельніцтва савецкі ўрад павінен яшчэ больш шпаркім тэмпам будаваць новыя буйныя фабрыкі і заводы, што і робіцца. Пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі—гэта ёсьць плян індустрыялізацыі.

У сувязі з гэтым я стаўлю пытаньне аб правядзеньні кампаніі па ўцягненьні сродкаў насельніцтва ў нашу дзяржаўную сыстэму.

Каб прысьпяшыць тэмп індустрыялізацыі, трэба на дапамогу тым сродкам, што ідуць на дзяржаўнаму бюджэту на пабудову фабрык і заводаў, уцягваць сродкі самога насельніцтва.

Нам трэба дабівацца, каб грошы не знаходзіліся на руках бяз руху. Таму мы кажам насельніцтву: „сёньня мы ня можам даць дастаткова тавараў, але наша гаспадарка расьце; чым хутчэй яна будзе расьці, тым хутчэй мы зможам даць патрэбную колькасьць тавараў, і вось калі ў каго ёсьць вольныя грошы, пазыч гэтыя грошы на час, на год, два, тры, ні пяць, табе дзяржава будзе плаціць процант. Табе дзяржава зьверне гэтыя грошы ў любую гадзіну, калі ты захочаш. Узяўшы іх у той момант, калі тавараў будзе досыць, ты зможаш на гэтыя грошы купіць тавараў па таннай цане. Але ў той-жа самы час, калі гэтыя грошы паступяць у дзяржаўны скарб, дык дзяржава зможа яшчэ больш грошай пусьціць на пабудову новых фабрык, заводаў і г. д.“. І таму мы праводзім цэлы шэраг кампаній: першая пазыка індустрыялізацыі, другая, трэцяя, узносы ў касы ашчаднасьці, збор павых узносаў у кааперацыю.

Вам прыдзецца на мясцох спаткацца з кампаніямі па ўцягненьні грошай насельніцтва ў дзяржаўны зварот—або ў пазыкі, або ў касы ашчаднасьці, або кааперацыю (спажывецкую, с.-г. і г. д.). Усе гэтыя кампаніі маюць на мэце ўзмацніць гаспадарчае становішча Савецкага Саюзу, павялічыць магчымасьці будаваць нашу гаспадарку. І таму гэтым кампаніям трэба садзейнічаць. Рабочая кляса Беларусі ў гэтым сэнсе праяўляе надзвычайную сьвядомасьць. Трэба каб і сяляне ішлі на сустрэчу савецкай улады і дапамагалі будаўніцтву, уносячы свае сродкі.

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З АНТЫСЭМІТЫЗМАМ.

Антысэмітызм, як праява клясавай барацьбы ворагаў савецкай улады супроць дыктатуры пралетарыяту мае месца на тэрыторыі Беларусі. Супроць гэтых праяў нам трэба весьці рашучую барацьбу, бо гэта ёсьць адна з небясьпечных небясьпек. Антысэмітызм накіраван на тое, каб разьбіць шэрагі працоўных, гэтым самым паслабіць саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту.

Супроць несьвядомага антысэмізму трэба весьці барацьбу шляхам тлумачэньня шкоднасьці і карэньняў гэтага; супроць праяў злоснага антысэмітызму трэба весьці самую жорсткую барацьбу, ня спыняючыся перад самымі жорскімі пакараньнямі, што мы і робім у сучасны момант.

РАЗГАРНУЦЬ САМАДЗЕЙНАСЬЦЬ, УЗЬНЯЦЬ КУЛЬТУРНЫ ЎЗРОЗЕНЬ.

Для палепшаньня культурнага становішча вёскі дзяржава прымае цэлы шэраг мерапрыёмстваў. Да такіх мерапрыёмстваў адносяцца: штогодняе павялічэньне ліку школ, павялічэньне і палепшаньне становішча бібліятэк, пашырэньне сеткі кіно-перасовак і г. д. Гэта з боку так званага культурнага абслугоўваньня вёскі. Тых сродкаў, што адпускае дзяржава, не хапае на ўсе гэтыя мерапрыёмствы. Запатрабаваньні ў насельніцтва вялікія. Дзеля таго, каб зьліквідаваць няпісьменнасьць у Беларусі на працягу бліжэйшых 5 год, трэба затраціць звыш 100 млн. р., ня ўлічваючы пабудовы школ (г. зн. толькі на падручнікі і аплату настаўнікаў). Мы па свайму бюджэту на гэтае мерапрыёмства маем магчымасьць выдаткаваць звыш 50 млн. руб., такім чынам, нам не хапае каля 50 млн. руб., або штогод каля 10 млн. руб. У зьвязку з гэтым мы зьвярнуліся да ўраду Савецкага Саюзу за дапамогаю; Савецкі Саюз пастанавіў, каб нам ужо ў гэтым годзе дапамагчы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Мы вядзем работу, каб павялічыць гэтую суму з агульнасаюзных сродкаў, думаем таксама крыху павялічыць водчуск сродкаў з нашых мясцовых бюджэтаў. Гэты прыклад я прывожу дзеля таго, каб паказаць, што нам прыходзіцца праводзіць усе культурныя мерапрыёмствы, таксама, як іншыя з вялікай напружанасьцю сродкаў. Гэтых сродкаў у нас не заўсёды хапае дзеля правядзеньня гэтых мерапрыёмстваў.

Тут вялікую ролю можа адыграць ініцыятыва і самадзейнасьць самога насельніцтва ў справе палепшаньня свайго культурнага быту. Калі ўжо гаварыць аб тым куды дзяваць сродкі, дык трэбы раіць, каб гэтыя сродкі накіроўваць у значнай меры на палепшаньне культурнага быту нашай вёскі, на барацьбу з брудам, на чыстыя з добрай вадою студні, на арганізацыю ўсякага роду культурных устаноў,—нардомаў, кіно-перасовак, радыё-установак і г. д. Запатрабаваньні насельніцтва ў гэтым сэнсе вельмі значныя.

Рух сярод працоўных у бок заваёвы культуры надзвычайна вялікі, ёй вельмі расьце, запатрабаваньні вельмі значныя і гэта нам трэба мець на ўвазе.

Скажу т. т., што кожны з вас будучы на вёсцы, у мястэчку і ў горадзе можа надзвычайна многа зрабіць для палепшаньня культурнага быту нашай вёскі.

Хто можа пацягнуць вёску? Зразумела перадавік, які мае многа энэргіі, запалу да працы. Грунтоўнай зьменай культурнага быту вёскі служыць калектывізацыя. Калектывізацыя палепшае кватэрнае становішча і становішча жанчын, агульныя ўмовы працы кожнага і г. д.

Дзяржава з кожным годам адпускае ўсе больш сродкаў на сацыяльна-культурнае абслугоўваньне гораду, вёскі, мястэчак. Сюды ўваходзіць абслугоўваньне культурна-асьветнае, мэдыцынскае, сацыяльнае, жыльлёвае, дарожнае і г. д. Але ў гэтай справе вялікае значэньне будзе адыгрываць таксама і самадзейнасьць самога насельніцтва і роля нашага актыву ў зьвязку з гэтым надзвычайна павялічваецца.

ЖЫЛЬЛЁВАЕ СТАНОВІШЧА Ў ГОРАДЗЕ.

У нашых гарадох жыльлёвы крызіс надзвычайна востры. Гэта тлумачыцца тым, што нашы гарады надзвычайна бурна растуць. Рост прамысловасьці, рост культурна-асьветных устаноў—усе гэта спрыяе значнаму росту нашых гарадоў. Нашы гарады це прыстасаваны былі для абслугоўваньня прамысловасьці, для абслугоўваньня культурна-асьветных запатрабаваньняў шырокіх мас насельніцтва. Звычайна гэта былі гарадкі з невялікай прамысловасьцю, з прыватным гандлем і з прыстасаваньнем да разгулу буржуазеі. Каб выйсьці з гэтага крызісу мы будуем новыя жыльлёвыя памяшканьні. Штогод мы на гэтую справу ўкладаем значныя сродкі, але мы задаволіць запатрабаваньняў ня можам, тым больш што гэтыя запатрабаваньні таксама растуць.

Мы ўжо ўклалі аграмадзейшыя сумы але адчуваецца жыльлёвы крызіс.

МАЕ ПАЖАДАНЬНІ ДЛЯ ВЕСКІ ДА XII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

Я-б хацеў, таварышы, каб вы перадалі ў вёску наступныя жаданьні: першае—12 год існаваньня, жыцьця і працы Савецкай Беларусі павінна служыць найлепшым прыкладам таго, што ўтварыўшы савецкую дзяржаву ў 1917 г. рабочыя і сяляне выбралі сабе правільны шлях. Толькі такім шляхам ідучы, мы можам дабіцца сапраўднага палепшаньня становішча шырокіх мас працоўных.

Той, хто прымае ўдзел у працы, хто прымае ўдзел у кіраўніцтве, хто шчыра прыглядаецца да гэтай працы, да гэтага будаўніцтва,—той павінен быць упэўненым барацьбітом за далейшае ўзмацненьне ўлады саветаў.

Другое—той плян сацыялістычнага будаўніцтва, які вызначан намі ў пяцігодцы, намі выконваецца больш пасьпяхова, чымся гэта мы самі думалі. Шмат мерапрыёмстваў, будзе намі выканана за 4 г. Гэта зн. мы будзем ісьці па шляху сацыялістычнага будаўніцтва больш буйнымі крокамі, чымся гэта мы нават разьлічвалі.

У гэтай пяцігодцы важнейшы вузлавы пункт — гэта індустрыялізацыя. Задача разьвіцьця прамысловасьці—гэта ёсьць задача жыцьця савецкіх рэспублік. Калі дзяржава напружвае сілы для разьвіцьця прамысловасьці яна мае на ўвазе інтэрэсы і рабочае клясы і працоўнага сялянства, і нам трэба дапамагаць усімі сіламі разьвіцьцю індустрыялізацыі. Гэта слова павінна быць блізкім, родным, знаёмым, кожнаму рабочаму, кожнаму працоўнаму селяніну, бо індустрыялізацыя прыносіць нам патрэбныя машыны пры дапамозе якіх мы пераможам прыроду, зробімся гаспадарамі ўсяго жыцьця і пашырым перамогу рэвалюцыі.

Другім вузлавым момантам пяцігодкі зьяўляецца калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Без калектывізацыі мы ня зможам дабіцца такога шпаркага поўнага палепшаньня тых шматмільённых мас сялянства, якія ідуць разам з рабочай клясай.

Калектывізацыя сябе цалком ужо апраўдала. Калектывізацыя ёсьць правільны шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі, і кожны сьвядомы працоўны селянін павінен ісьці сьвядома на калектывізацыю гаспадаркі, бо праз гэта ён паляпшае сваё матар'яльнае становішча, паляпшае бытавыя ўмовы, вызваляе ад рабскага падпарадкаваньня прыродзе, утварае моцны фундамант да перамогі сацыялізму.

Барацьба за калектывізацыю стаіць на аднолькавай ступені з барацьбой за індустрыялізацыю.

Трэцім вузлавым момантам пяцігодкі зьяўляецца барацьба за культурнае разьвіцьцё нашай краіны: ліквідацыя няпісьменнасьці, пашырэньне тэхнічных ведаў сярод насельніцтва, барацьба супроць усіх забабонаў, барацьба з тымі зьявішчамі, якія ідуць з варожага нам кулацка-нэпманскага лягеру.

Трэцяе. Я-б хацеў, каб вы перадалі таксама і тое, што ўсё наша будаўніцтва, усё наша жыцьцё павінна грунтавацца на ўзмацненьні саюзу рабочае клясы з бяднейшым і сярэднім сялянствам і ісьці пад кіраўніцтвам кампартыі.

Толькі ў тым выпадку, калі гэты саюз будзе існаваць і ўзмацняцца, мы зможам перамагчы. Адсюль вынікаюць задачы рашучай барацьбы пад кіраўніцтвам кампартыі супроць кулацкіх і нэпманскіх элемэнтаў.

Чацьверты. Да XII гадавіны Кастрычніка павінны яшчэ больш павялічыць нашу ўвагу да Чырвонай армії.

І нарэшце, я хацеў-бы каб вы перадалі аб ролі камуністычнай партыі і аб ролі камсамолу ў нашым жыцьці ў нашым будаўніцтве. Камуністычная партыя ёсьць авангард і правадыр працоўных у барацьбе за камунізм. Камуністычная партыя складаецца з перадавых найлепшых рабочых і сялян, якія аддаюць усё сваё жыцьцё, усе свае імкненьні на сацыялістычнае будаўніцтва.

Мы правялі і праводзім чыстку партыі. Да гэтай чысткі мы прыцягнулі ня толькі партыю, але і ўсіх працоўных. Працоўныя ўдзельнічалі ў чыстцы партыйных арганізацый, давалі сваю ацэнку паасобным партыйцам, тым самым садзейнічалі чыстцы партыі ад варожых, прымазаўшыхся элемэнтаў.

Тым самым сувязь партыі з працоўнымі масамі яшчэ больш узмацнілася і павінна ўзмацняцца надалей.

Таму кожны з вас павінен дапамагаць і партыі, і камсамолу ў правядзеньні ўсіх мерапрыёмстваў і разам з імі, пад іх кіраўніцтвам, выконваць на мясцох тыя задачы, якія перад імі стаяць. Гэта будзе служыць гарантыяй таго, што мы пераможам у барацьбе за камунізм. Мы небяспераможам, бо мы ўжо пачалі перамагаць.

Дэлегацыя чырвонаармейцаў-адпускнікоў у тав. Галадзеда.

29 кастрычніка старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. М. М. Галадзед прыняў дэлегацыю чырвонаармейцаў-адпускнікоў № Стралковай Беларускай Дывізіі ў ліку 45 таварышоў.

Тав. Галадзеду было зададзена шмат надзвычайна жыцьцёвых і цікавых пытаньняў, на якія тав. Галадзед адказваў некалькі гадзін.

Чым цікавіліся адпускнікі?

Пытаньні гэтыя, якія задаваліся чырвонаармейцамі - адпускнікамі тав. Галадзеду, зводзіліся галоўным чынам, да наступным момантаў.

Разьвіцьцё сельска-гаспадарчай прамысловасьці, машынізацыя і электрафікацыя сельскай гаспадаркі на другі год пяцігодкі; палепшаньні ў справе культурнага абслугоўваньня вёскі і ў прыватнасьці па ліквідацыі няпісьменнасьці, арганізацыі хат-чытальняў у БССР і інш. па нашай пяцігодцы; мерапрыемствы па паляпшэньню работы савецкага апарату, асабліва ў райёнах і сельсаветах, чыстка савецкага апарату; новы зямельны кодэкс БССР, які ў сучасны момант перададзены на абгаварэньне шырокіх пластоў працоўных мас; задачы сельска-гаспадарчай выстаўкі; сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы; зьмяншэньне беспрацоўя; перасяленьне; работа Асоавіяхіму ў вёсцы і шэраг іншых пытаньняў. У канцы адпускнікі задалі наступнае пытаньне: якія пажаданьні перадаць ад вас нашым бацькам і вёскам.

На гэтае запытаньне тав. Галадзед адказаў так: „Я-б вынес адно пажаданьне для вас, вашых бацькоў і вёсак, гэта каб усе вёскі, у якія вы зьвернецеся,—ператварыліся ў сплажныя калектывы. Вось вам маё самае лепшае пажаданьне. Зрабіце так, каб тыя вёскі, куды вы прыедзеце, ператварыліся з хутароў і насёлкаў у калектывы—гэта самае асноўнае. Калі вы даб'ецеся гэтага, то напішэце мне вясною ліст, як у вас абстаіць справа з калектывізацыяй і я з вялікаю прыемнасьцю прачытаю яго і дам адказ. Буду садзейнічаць, калі ў вас справа калектывізацыі ня пойдзе на лад.

Аснова ўсёй нашай работы на вёсцы зараз заключаецца ў сацыялістычнай перабудове сель кай гаспадаркі. Адсталую сялянскую гаспадарку трэба перабудаваць у буйную культурную сацыялістычную гаспадарку. Гэта адзіны шлях, які выведзе нашу вёску і сялянства з забітасьці, жабрацтва і недахопаў. Другога шляху няма“.

З усяе гутаркі было відаць, што нашы чырвонаармейцы ня толькі падрыхтаваны і асьведамлёны як байцы, але падрыхтаваны як і добрыя савецкія грамадзяне. Наш чырвонаармеец цікавіцца ня толькі пытаньнямі асабістых момантаў, а і пытаньнямі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны, такім чынам, наша Чырвоная армія рыхтуе ня толькі байцоў за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю, за дыктатуру пралетарыяту, але і добра падрыхтаваных працаўнікоў для саветаў, каапэрацыі, савгасаў і калгасаў.

Чырвонаармейцы-адпускнікі гэтаю гутаркаю з Старшынёй Савету Народных Камісараў тав. Галадзедам засталіся надзвычайна задаволены.

Няўдачы ў фармаваньні новага ўраду

Брыян абяцае дапамогу Дэлад'е.

ПАРЫЖ, 29-X. Агенцтва Гаваса паведамляе, што Дэлад'е адмовіўся складаць новы ўрад.

* * *

ПАРЫЖ, 29-X. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Брыян заверыў Дэлад'е, што ён дапаможа яму, калі Дэлад'е будзе праводзіць перамовы в мэтаю складзьці ўрад рэспубліканскага адзіненьня. У сувязі з гэтым Дэлад'е адмовіў перамовы. Пасьля гэтага Дэлад'е ізноў адмовіўся ад даручэньня скласьці ўрад Ён заявіў, што адмаўляецца ад дадзенага яму даручэньня, бо затрыманьне, у якім ён быў упэўнены, аказалася абумоўленым складаньнем ураду рэспубліканскага адзіненьня. Такі ўрад азначаў бы габінэт нацыянальнай канцэнтрацыі, супроць якога радыкалы супярэчаць.

Клемантэль прыняў прапанову скласьці ўрад.

ПАРЫЖ, 30-X. Гавас паведамляе: «Выліканы да Думорга Клемантэль згадзіўся на прапанову скласьці ўрад».

Заўвага: сэнатар Клемантэль нарадзіўся ў 1864 годзе, быў некалькі разоў міністрам: ва ўрадзе Клемансо ў 1917-20 г. і ва ўрадзе Эрыё—у 1924-25 г.

У КРАЇНАХ БЕЛАГА ТЭРОРУ.

НА БЕЛЫ ТЭРОР ПАЛІТВЯЗЬНІ КАПІТАЛУ АДКАЗВАЮЦЬ МАСАВЫМІ ГАЛАДОЎКАМІ.

Зацяжная галадоўка палітвязьняў у вэнгерскіх астрогах.

ВЕНА, 29-X. З Будапешту паведамляюць, што галадоўка палітычных вязьняў вэнгерскіх астрогаў ня спыняецца. Афіцыёзныя завярэньні, нібыта сацыял-дэмакратычныя і беспартыйныя зьняволеныя спынілі галадоўку—ня маюць падставы. Палітычныя зьняволеныя ў акруговым астрозе Будапешту забарыкадаваліся ў камэрах, каб выратавацца ад пакут штучнага харчаваньня. Варта гвалтам уварвалася ў камеры. Палітычныя зьняволеныя пакараны высылкаю на тыдзень у астрожны карцэр і пазбаўленьнем на 3 месяцы права спатканьняў, перапіскі і чытаньня кніг. Кіраўніцтва астрогу пагражае новымі рэпрэсіямі.

ВЕНА, 29-X 25-га кастрычніка ў Будапэшце і іншых гарадох Вэнгрыі распаўсюджваліся лятучкі кампартыі, якія патрабавалі спыніць катаваньні палітзьняў у астрогах, выканаць патрабаваньні палітвязьняў і ўсеагульнай амністыі. 26-го кастрычніка перад акруговым астрогам у Будапэшце некалькі сотняў рабочых бурнымі выгукамі пратэставалі супроць суровасьцяў у астрозе і патрабавалі амністыі. Паліцыі ледзь удалося разганяць дэманстрантаў. Учынена шэрае арыштаў.

Ахвяры белага тэрору.

ВЕНА, 29-X. Згодна паведамленьня з Будапешту, камсамолец Аляксандр Леві, засуджаны на працэсу Санто на 3 з паловай гады зьняволеньня, памёр у астрозе ад цяжкага стану здароўя ў сувязі з суровым рэжымам.

Рэдактар „Юманітэ“ засуджан на 5 год

ПАРЫЖ, 30-X. Быўшы адказны рэдактар газэт „Юманітэ“, „Казэрн“ і «Авангард» Дэні Ўчора засуджан за зьмяшчэньне артыкулаў у гэтых органах на тэму аб ваенных падрыхтоўках Францыі і аб старовіцтві салдат у французкай армії—на 5 гадоў астрогу і 3 тысячы франкаў штрафу.

Арышты і высылка з Злучаных Штатаў рабочых чужаземцаў.

НЬЮ-ЁРК, 27-X. У Чыкага паліцыя арыштавала некалькі сотняў рабочых —чужаземцаў, якія бралі актыўны ўдзел у рабочым руху. Арыштаваныя высылаюцца са Злучаных Штатаў.

Камуністычных дэпутатаў пад суд.

БЭРЛІН, 28-X. Прускі ляндтаг ухваліў пастанову аб аддачы пад суд 23-х дэпутатаў ляндтагу, пераважна камуністаў.

У Саюзных Рэспубліках.

Прысуд па справе астраханскіх шкоднікаў.

АСТРАХАНЬ, 28-X. Пасьля чатырохдзённай нарады а 4 гадзіне дню суд вынес пастанову па астраханскай справе. 14 чалавек прыгаворана да растрэлу: Панкоў, Пратадзяканаў, Аўдзеяў, Адамаў; Уласаў, Аляксеяў, Семікаў, Салдатаў Ян, Блох, Вішняпольскі, Палявы, Заслаўскі, Хацкель, Кузьняцоў Сьцяпан і Калінін. На 10 год зьняволеньня прыгавораны, прыватнікі Лісоў, Растоў, Салдатаў Якуб, Шлейн, Ханоавераў, Кантар Іосіф, Гладчанка, Узілеўскі і служачыя — Сігалаў, Стругала, Чурашаў, Якаўлеў і

Да ўсіх прафарганізацый, да ўсіх членаў саюзаў Беларусі.

Таварышы!

Бурны рост сацыялістычнага сэктару гаспадаркі, захаваньне і правышэньне ўзятых тэмпаў будаўніцтва,—патрабуе ад кожнага рабочага, ад кожнага члена саюзу мансымуму энэргіі, творчай ініцыятывы і арганізаванасьці, якія канцэнтруюць на перамогу цяжкасьцяй, нямінуючя ўзьнікаючых на шляху гэтага росту. Адной з галоўных цяжкасьцяў зьяўляецца праблема забесьпячэньня хлебам і харчоўнымі прадуктамі. Пралетарыят разьвязвае гэтую задачу, арганізуючы буйныя савгасы і калгасы, якія ўжо ў гэтым годзе даюць 45 проц. патрэбнага дзяржаве хлеба.

Але разам з гэтым для забесьпячэньня плянавага снабжэньня гарадоў і асабліва рабочых цэнтраў, сялянскай беднаты хлебам і іншых прадуктамі харчаваньня, набыцьця патрэбных рэзэрваў для таго, каб ня даць магчымасьці кулаку і спэкулянту праізвольна падымаць цэны на хлеб і тым зрываць наша сацыялістычнае будаўніцтва,—рабочай клясе і працоўнаму сялянству патрэбна ў максымальнай меры арганізавана і ў больш хуткі тэрмін правесьці хлебазагатоўчую кампанію як сярод сац. сэктару нар. гаспадаркі, таксама і сярод сялянства. Гэтая кампанія павінна быць скончана да 1-га студзеня 1930 г. Маючыяся на сёньня весткі сьведчаць аб тым, што выкананьне хлебанарыхтоўчых пляноў па Беларусі даходзіць да 73 проц. Бяднейшае сялянства, серадняк і батрацтва дружна адгукнуліся на прызыў партыі, сплаціліся вакол не лёзунгу, правялі сваю сьвядомасьць і выконваюць свае абавязкі перад краінай, здаючы свае лішкі пралетарскай дзяржаве.

Навакол загатоўкі хлеба абвастрылася клясавая барацьба. Кулакі не здаюцца, яны хаваюць свой хлеб, каб сарваць хлебазагатоўкі, сарваць палітыку цэн. Атрутнымі шэптамі, падпаламі,—кулацтва думае палохаць перадавы сялянскі актыў і пасеяць розьнь паміж пралетарыятам і асноўнымі масамі сялянства. Але бядняк і серадняк добра ведаюць каштоўнасьць кулацкіх шэптаў, сапраўдныя намеры кулацтва,—мець большую магчымасьць трымаць у кабале беднату, а часамі і серадняка.

Прафэсыянальныя саюзы ўжо пасылалі свае брыгады на хлебанарыхтоўкі. Яны арганізавалі беднату і серадняка для адпору кулаку, утваралі чырвоныя абозы, вялі растлумачыцельную работу, разаблачалі сапраўдныя мэты кулацтва і задачы батрацтва, беднаты і серадняка. Але гэтая работа праведзена яшчэ не ў дастатковай меры. Трэба зараз-жа мінуць яшчэ ў большай меры рабочае ядро на дапамогу хлебанарыхтоўкам.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі цалкам падтрымлівае адозву УсеЦСПС аб хлебанарыхтоўках і заклікае праф. арганізацыі Беларусі напрэч усе сілы для іх ажыцьцяўленьня.

Таварышы рабочыя. Арганізуйце брыгады і пасылайце іх на вёсну, узмацніце свой канкрэтны ўдзел у выкананьні важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства партыі і ўлады, апіраючыся на беднату ў саюзе з серадняком—арганізуйце рашучы адпор кулацтву ў яго спробе мяшаць сацыялістычнай перабудове ўсяе нар. гаспадаркі.

ТАВАРЫШЫ РАБОЧЫЯ, АСЬВЕТНІКІ, УРАЧЫ, РАБОТНІКІ ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ВЁСЦЫ!

Вы больш усяго сустракаецеся з сялянствам, на Вас ускладаецца адказнейшая задача, як у справе растлумачэньня сялянству значэньня хлебазагатовак, так і ў справе арганізацыі здачы лішкаў, арганізацыі адпору кулаку.

Таварышы рабочыя і служачыя—маючыя свае гаспадаркі—будзьце застрэльшчыкамі ў арганізацыі прафаюзных абозаў, арганізуйце спаборніцтва па здачы лішкаў, прыцягніце да гэтай справы бяднацка-серадняцкія колы вёскі.

Таварышы рабочыя і служачыя арганізуйце збор тары (мяшкоў), арганізуйце рабочы кантроль за складамі, за хлебазагатоўчымі арганізацыямі, арганізуйце дапамогу ім, арганізуйце суботнікі дзеля больш хуткай разгрузкі і нагрузкі хлеба на чыгунцы, не дапускайце прастояў, пробак.

Таварышы работнікі хлебазагатоўчых апаратаў і ячэйкі саюзу савгандльслужачых—узмацніце выхаваўчую работу сярод сваіх работнікаў, растлумачце ім усю адказнасьць іх работы, рашуча ачышчайцеся ад тых, хто ня хоча працаваць рэвалюцыйным тэмпам, хто бяздушнымі бюракратычнымі адносінамі да сялянства выклікае іх нараканьні і перашкаджаючы хлебазагатоўкам, іграе на руку клясавым ворагам.

Таварышы сельгаслесарабочыя і батрацтва--дапамагайце чоткаму і хуткаму разгортаньню кампаніі на вёсцы, выкрывайце кулацтва, якое ня хоча здаць свае лішкі, выкрывайце нядбайных сельсаветчыкаў і агэнтаў кулацтва, якія залезьлі ў каапэрацыю, у загатоўчы апарат, арганізуйце для адпору кулацтву—беднату, калгасьнікаў, арганізуйце здачу калгасамі і савгасамі сваіх лішкаў да 12-й гадавіны Кастрычніка.

„80 проц. гадавога заданьня--да 12-й гадавіны Кастрычніка" на ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу УсеЦСПС кануруе усе сілы, усю ўвагу рабочых мас і бяднацка-серадняцкіх колаў вёскі.

Усе прафсаюзныя арганізацыі яшчэ раз праверце ці ўсё Вы зрабілі, каб дапамагчы дзяржаве забясьпечыць 100 процантнае выкананьне пляну нарыхтовак.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі.

ДА БІБЛІАТЭЧНАГА ПАХОДУ.

Рэканструкцыя народнай гаспадаркі патрабуе значнага падвышэньня культурнага ўзроўню працоўных. Здаволіць цягу рабочых і працоўнага сялянства школамі, курсамі мы не заўсёды маем магчымасьць. Значна большую магчымасьць дае самастойная падрыхтоўка, у якой вялікую ролю могуць адыграць бібліатэкі.

Зараз партыя ставіць рашуча пытаньне, наколькі задавальняе ў сучасны момант працоўныя масы абслугоўваньне **бібліатэкай-кніжнай**, якое кніжка займае месца ў барацьбе з няпісьменнасьцю, малапісьменнасьцю і недастатковай нашай культурнасьцю. У якім стане знаходзіцца работа нашых бібліатэк, прыстасаваньне іх для лепшага абслугоўваньня рабочых і батрацкіх, бядняцка-серадняцкіх мас.

У БССР бібліатэчная справа знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Бібліатэка адарвана ад партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, бібліатэка — забыты куток нашай працы.

Бібліатэчны паход, які пачынаецца з 1-га лістапада, ставіць сабе задачай усямернае прасоўваньне кніжкі ў масы і непасрэдная грамадзкай работы бібліатэк з тым, каб бібліатэка зьяўлялася культурным асяродкам для працоўных мас, адпавядаючым задачам культурнай рэвалюцыі. Кіруючыся распрацаваным камісіяй пляном бібліатэчнага паходу, трэба асабліва дамагчыся выкананьня наступнага:

Усю працу па бібліатэчнаму паходу трэба праводзіць шляхам мабілізацыі ўсяе грамадзкасьці працоўных мас вакол кніжкі, бібліатэчнай аправы пад непасрэдным кіраўніцтвам і ўдзелам партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый.

Бібліатэчны паход павінен зьявіцца, як далейшае разгортваньне культпаходу. Бібліатэчны паход не часовая кампанія, а сталая работа на працягу ўсяго году да 1-га бібліатэчнага зьезду.

Для больш шырокага разгортваньня і ажыўленьня работы па бібліатэчнай справе і прасоўваньня кніжкі ў масу трэба дамагацца больш шпаркага сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі рэспублікамі, акругамі, раёнамі, бібліатэчнымі работнікамі і чытачамі па абслугоўваньне рабочых, бядняцкіх і батрацкіх мас.

Для лепшага абслугоўваньня працоўных мас трэба перайсьці на бесперапынны працоўны тыдзень.

Вялікую ролю ў бібліатэчным паходзе павінны адыграць групы „лёгкай кавалерыі", матар'ялы абсьледваньня якіх павінны асьвятляцца ў друку, на сходах бібліятэчных работнікаў і агульна-гарадзкіх канфэрэнцыях чытачоў.

На працягу бібліятэчнага паходу трэба асабліва рашуча высунуць пытаньне аб папаўненьні новымі кадрамі бібліятэчных работнікаў, аб іх больш рашучым высоўваньні і падрыхтоўцы.

Камсамольская арганізацыя павінна ў большай меры даць новыя кадры бібліятэчных работнікаў.

Разгортваньне шпаркім тэмпам калектывізацыі ставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб бібліятэках для савгасаў і калгасаў, аб максымуме ўзмацненьня гэтых бібліятэк і ў прыватнасьці аб выданьні шэрагаў танных папулярных кніг для калгасаў.

Партыец, камсамолец, дэлегатка, рабочы, вясковы актывіст, сябра грамадзкіх арганізацый—усе на дапамогу бібліятэчнаму паходу. Зробім кніжку-бібліятэку актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва і дапаможнікам выкананьня пяцігодкі.

Наркамасьветы, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ЧЫСТКІ ЯЧЭЙКІ НАРКАМАСЬВЕТЫ.

У справаздачы ячэйкі выявіліся прымірэнчыя адносіны да нацыянал-дэмакратызму, нерашучасьць і мяккацеласьць да канкрэтных праяў яго. На сходзе мела месца нацыянал-дэмакратычная вылазка.

Ячэйка НКА не праводзіла выразнай клясавай лініі.

Сёмы дзень працягваецца праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы. Сёмы дзень ідзе ўсебаковы агляд працы ячэйкі, паасобных камуністаў, а таксама і ўсяго апарату НКА.

Чыстка і праверка ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы выклікала значную зацікаўленасьць рабочых, працоўнай інтэлігенцыі і студэнцтва нашых навучальных устаноў, чыстка і праверка ячэйкі праходзіць заўжды пры перапоўненай залі.

У сваім дакладзе сакратар ячэйкі КП(б)Б т. Гурскі адзначыў, што ячэйка арганізавалася толькі год таму назад. Ячэйка мае 20 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх 9 зьяўляюцца выхадцамі з іншых дробна-буржуазных партый: эсэраў, бунд, поалей-цыон і г. д. Галоўная ўвага ячэйкі была згрупована на ажыцьцяўленьні лініі партыі ў галіне культурнага будаўніцтва. Як-жа ячэйка справілася з гэтаю надзвычайна важнаю задачаю?

У сваёй практычнай працы ячэйка ставіла шэраг актуальнейшых пытаньняў, як палепшаньне справы культурнага будаўніцтва, правядзеньне ў дзейнасьці апарату НКА выразнай, вытрыманай пралетарскай клясавай лініі, разгортваньне самакрытыкі, сувязь НКА з рабочымі масамі і іншыя пытаньні. Як гэтыя пытаньні ячэйкаю вырашаны?

Трэба адзначыць, што ячэйка ня з усімі гэтымі задачамі справілася, што ў яе дзейнасьці яскрава выявілася мяккацеласьць пры практычным ажыцьцяўленьні некаторых пытаньняў.

Вось прыклады. Важнейшым пытаньнем у працы ячэйкі і НК Асьветы зьяўляецца пытаньне падрыхтоўкі кадраў працаўнікоў для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. У дзейнасьці кіраўнікоў НКА заўважалася няправільная, шкодная арыентацыя на групку старых кадраў інтэлігенцыі. Ячэйка сыгналізавала небясьпеку, паставіла пытаньне аб падрыхтоўцы новых кадраў, але-ж да канца цьвёрда і рашуча гэтага пытаньня не правяла.

Міма ячэйкі прайшло і другое пытаньне--гэта тэатральная дыскусія. Праўда, ячэйка на сваім агульным сходзе асудзіла выступленьне свайго члена тав. Жылуновіча, які па сутнасьці ўзяў пад абарону выступленьні ў друку т. Глыбоцкага, аднак і тут ячэйка была недастаткова рашучай, не паставіла належным чынам кропкі над «і».

На далейшыя глыбока палітычныя і шкодныя памылкі т. Жылуновіча, у якіх ён у сучасны момант сазнаўся, ячэйка зусім не рэагавала.

У ячэйцы вельмі слаба была разгорнута самакрытыка. У сваім дакладзе гэта яскрава падкрэсьліў сакратар ячэйкі. Між тым і тут правільна ўзяты ў пачатку напрамак разьвіцьця самакрытыкі быў самою ячэйкаю зманаваны. Магчыма было-б прывесьці надзвычайна шмат прыкладаў, калі ячэйка ў сваёй працы ня было цьвёрдай, здавала пазыцыі пад націскам некаторых адказных працаўнікоў НКА.

Надзвычайна характэрны паводзіны некаторых адказных працаўнікоў НКА ў справе разгортваньня самакрытыкі. Напрыклад, у час чысткі т. Баліцкага, былога Наркамасьветы, амаль ніхто з адказных працаўнікоў НКА не выступаў і не гаварыў аб памылках т. Баліцкага, наадварот некаторыя хвалілі яго як працаўніка, як члена партыі.

У сучасны-ж момант агонь самакрытыкі галоўным чынам накіраваны з боку гэтых таварышоў па адрасу т. Баліцкага. Між тым права-апартуністычныя памылкі ў дзейнасьці НКА зьяўляюцца ня толькі віною т. Баліцкага, але і ўсяго парткалектыву НКА і галоўным чынам членаў партыі, якія пастаўлены на чале кіраўніцтва НКА. Некаторыя з т. т. у спрэчках адзначалі, што нам. Наркамасьветы т. Слонім раней гаварыў, што паміж ім і т. Баліцкім ніякіх непаразуменьняў няма, а ў сучасны момант аб памылках т. Баліцкага шмат гаворыць, нічога не кажучы аб тым, што ён рабіў сам, каб гэтыя памылкі выправіць.

З дакладу т. Гурскага выявілася, што апарат НКА патрабуе значнага абнаўленьня, што туды неабходна ўліць новыя сьвежыя сілы. У НКА дрэнна пастаўлена праца з выпускам падручнікаў. У падручніках ёсьць шэраг месц ідэолёгічна невытрыманых. Часопісь „Асьвета" на сваіх старонках не адбівае сучасных актуальных палітычных пытаньняў. На працягу цэлага шэрагу гадоў у ВНУ пралазілі варожыя нам элементы з варожага асяродзьдзя пры дапамозе некаторых працаўнікаў НКА. Нават у гэтым годзе былі выпадкі, калі паасобнымі працаўнікамі НКА выдаваліся запісачкі некаторым асобам аб прыёме іх у ВНУ. Усе гэтыя недахваты патрабуюць выпраўленьня і ажыцьцяўленьня ў далейшым дакладным, выразнай клясовай лініі ў дзейнасьці НКА, якая-б цалкам і поўнасьцю адпавядала сучасным задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Нацыянал-дэмакратычная вылазка.

У спрэчках па дакладу шэраг т-шоў фактычным матар'ялам даказалі, што ў ячэйцы і апараце НКА амаль што не вялося барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам, які ў сучасны момант асабліва небясьпечны для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Былі прымірэнчыя адносіны, была няцьвёрдасьць, нерашучасьць у барацьбе з канкрэтнымі праявамі нацыянал-дэмакратызму.

У час праверкі т. Жылуновіча, які зрабіў за апошнія гады шэраг грубых палітычных памылак, які ў некаторых сваіх творах праводзіў нацыянал-дэмакратычныя погляды, мела месца арганізаваная нацыянал - дэмакратычная вылазка фэспартыйнага, М. Гарэцкага і камуністаў Марука, Івана Цьвікевіча і Ільлючонка П. М. Гарэцкі адкрыта заявіў, што клясавыя інтарэсы павінны іншы раз падначальвацца інтарэсам нацыянальным.

Камуністы Марук, Цьвікевіч І. і П. Ільлючанак у сваіх выступленьнях разгарнулі цэлую сыстэму нацыянал-дэмакратычных поглядаў, яўна антыпартыйных. Яны хацелі даказаць, што жорсткая барацьба партыі з нацыянал-дэмакратызмам—гэта барацьба з „беларускасьцю», што гэта праяўленьне вялікарасейскага шавінізму і г. д. Яны ў сваіх выступленьнях фактычна бралі пад абарону тыя вялізарныя памылкі, якія былі зроблены т. Жылуновічам.

Т. Жылуновіч і сам адмовіўся ад такіх „абаронцаў".

На сходзе камуністы, беспартыйныя рабочыя і прадстаўнікі працоўнай інтэлігэнцыі далі рашучы адпор нацыянал-дэмакратычным вылазкам. У выніку гэтага адпору ўжо паступіла дзьве заявы ў камісію па чыстцы і праверцы ячэйкі, у якіх удзельнікі выступленьня б'юць адбой з „тлумачэньнямі" прычын выступленьня.

Ачысьцім шэрагі Ленінскай партыі ад нацыянал-дэмакратаў

Рэзалюцыя агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б Камвузу Беларусі імя Леніна (прынята аднагалосна).

Заслухаўшы інфармацыю т. САЕВІЧА аб новай нацыянал-дэмакратычнай вылазцы, агульны сход ячэйкі Камуністычнага Ўнівэрсытэту Баларусі імя Леніна заяўляе: цалкам і поўнасьцю салідарызуемся з ацэнкай гэтага выступленьня, якая дана ў перадавой „Зьвязды" ад 30-га кастрычніка 1929 г.

1) Агульны сход лічыць, што а) група Ільлючонка, Марука і Ів. Цьвікевіча (партыйцы) абараняла контр-рэвалюцыйную, нацыянал-дэмакратычную лінію, якая ўжо была вызначана радам ранейшых выступленьняў нацыянал - дэмакратаў, у прыватнасьці, у часе тэатральнай дыскусіі і „лісьце трох";

б) што гэта група сваім выступленьнем стала на чале нацыянал-дэмакратычнай атакі на партыю і яе Ленінскі ЦК;

в) што паміж гэтымі „партыйцамі" і рэштай нацыянал-дэмакратаў зьніклі ўсе межы;

г) што гэта група карыстаецца зброяй, якая ўзята з арсэналу польскага фашызму і заходняе беларускага нацыянал-фашызму.

2. Сход патрабуе выключэньня гэтай групы з радоў партыі.

3. Агульны сход шле сваё гарачае прывітаньне ЦО нашай партыі „Зьвязьде", якая па бальшавіцку і своячасова выкрывае ўсе праявы нацыянал-дэмакратызму і стаіць па варце ленінскай лініі нашай партыі.

4. Агульны сход з усёй рашучасьцю заяўляе, што партыйны калектып КУБ'а аддасьць усе свае сілы бальшавіцкаму ЦК КП(б)Б для барацьбы з ўсялякімі ўхіламі ад ленінскай лініі партыі.

Агульны сход заклікае ўсю партыйную арганізацыю узмацніць барацьбу з усімі праявамі нацыяналізму і шавінізму і асабліва з найбольш небясьпечным зараз беларускім нацыянал - дэмакратызмам.

Гусіным кроам

(Аршаншчына)

Большасьць акруговых арганізацый Аршаншчыны—КП(б)Б, АПБ, АВК перавял боту на бесперапынны пр дзень. Але толькі большась частка—меньшая... толькі вае" пытаньне. Цікава, п адбываецца ў хаотычным п ма ўвязкі—кожны па свой

Здавалася-б, што акруговы павінны былі-б прадбач Неабходна было-б стварыц якая-б рэгулявала ўстанаўл насяджэньня асобных устан нізацый,—партдзень, дзен прафдзень і г. д. Ёсьць уста рэкламіруюць толькі яшчэ «бесперапынку».

Вось, напрыклад, АВК па рузе разаслаў друкаванае аб што „АВК і яго аддзелы і рыяты з 1-га кастрычніка пераходзяць на бесперапынны тыдзень", а на справе... ве ў нядзелю 6-га кастрычн „сьвяткуюць" аддзелы адмін ны і фінансавы. «Сьвяткуюц ма некаторыя і другія ўстан пытаньне аб пераходзе на бес ку толькі яшчэ „распрацоўва

Слаба праца прафсаюзаў напрамку, у прыватнасьці па прадпрыёмстваў.

Гэта паказвае яшчэ наш ласьць, непаваротлівасьць у час перабудаваць сваю работу апаратаў і ўстаноў так, як трабуецца тым ці іншым нашага сацыялістычнага буд так як вымагае ад нас сучас бяз шуму і арганізавана

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Буйны калгас „Новы Шлях".

Полацак, 28-X. Сярод сялян в. Шайтрава, Валынецкага раёну, праведзена растлумачыцельная праца ў галіне калектывізацыі вёскі. Адбылося шэраг сходаў. У выніку сяляне парашылі стварыць калгас „Новы Шлях", які налічвае больш 40 гаспадароў. Ёсьць поўныя надзеі, што ў хуткім часе да калгасу далучацца вакольныя вёскі.

Зараз калгасьнікі прыступілі да набыцьця розных сельска-гаспадарчых машын. Пачалося будаўніцтва памяшканьняў пад жыльлё і для жывёлы. Калгасу аказваецца неабходная дапамога з боку раённых арганізацый.

Па ўсіх правілах.

Па вуліцах гор. Горкі раскінуліся 8 ларкоў і 4 больш буйных каапэратываў. Ля іх, па суседзтву, знаходзяцца яшчэ і прыватныя крамы. Каапэрацыйныя крамы абслугоўваюць шмат насельніцтва: 2000 студэнтаў, насельніцтва гораду і амаль усё насельніцтва Горацкага раёну, бо Горацкі раён больш на хутарах і там на месцы няма каапэратываў.

Улічваючы гэта, каапэрацыя г. Горкі павінна працаваць як мае быць. На справе яна працуе зусім дрэнна.

З тавару, як бялізна, цукар, сала, масла—зусім няма. Што ёсьць? Цукеркі, сярнічкі... Яшчэ важна адзначыць несваечасовае адчыненьне крам. На ўсіх крамах рэзка кідаецца ў вочы шыльды—„адкрыта з 9 да 1 г. і з 2-х да 6 гадз.". На справе зусім інакш.

На гарадзкім гадзільніку б'е палова дзесятай, а крамы на замках. Чарга на двары—вялікая. З боку, па суседзтву, прыватнік адчыніў троха раней 9 гадзін. Чутны галасы—„дзе капейка не прапала, там куплю".

Крамы адчыніліся: цесната, крык, тавары атрымлівае хутчэй той, у каго голас громкі і сілы больш. І на справе крамы працуюць з 10 гадз. да 1, з 2 з пал. да 5 гадз.

Ужо гэта ўвайшло ў закономернасьць. Пацьвярджаецца гутаркамі кожны дзень —„Сёньня будзе адчынена?".—„Што ты шыльды ня бачыш?".—„Дык ужо зараз гадзіна пройдзе, як трэба адчыніць",—„Гэта, брат, ужо па закону".

Дык ці так трэба ў такой мясцовасьці працаваць??

У прыватніка адчынена, а ў краме каапэратыву на гадзіну пазьней?

Немеры.

Больш гібкасьці ў загатоўках

(Гомельская акруга).

Ва ўсіх раёнах акругі загатоўкі бульбы ідуць здавальняюча. Са станцыі Хойнікі ўжо адпраўлен у Ленінград эшалён з бульбай у колькасьці 44 вагонаў. Учора на гэтай-жа станцыі грузіўся другі эшалён. Са станцыі Церахоўка адпраўлена 8 вагонаў бульбы. У Лоёўскім раёне на прыстані знаходзіцца да 150 тысяч пудоў бульбы. Туды паслана 2 баржы і ўчора вечарам накіравалі параход для нагрузкі і дастаўкі ў Гомель бульбы. У Чачэрскім раёне на прыстанях ляжыць вялікая партыя бульбы. Для яе нагрузкі ў Чачэрск накіраваны дзьве баржы і сёньня раніцою туды пасылаецца 4000 мяхоў і яшчэ дзьве баржы.

У Буда-Кашалёўскім раёне на станцыі вышаў затор. Чыгунка спазьняецца з падачай вагонаў. Дзеля выяўленьня на месцы прычын затору туды выехаў упаўнаважаны Савнаркому па нашай акрузе тав. Дубіна. У Брагінскім раёне ўжо загатавана да 40 тысяч пудоў бульбы. У Гомельскім раёне з-за дрэннага надвор'я затрымана дастаўка бульбы 10 чырвонымі абозамі. У Ветку ўчора раніцою накіроман параход для дастаўкі бульбы ў Гомель.

Трэба адзначыць, што на паасобных пунктах разгрузцы і выгрузцы бульбы перашкаджае адсутнасьць мяхоў. Саюзхлеб, на абавязак якога ўскладзена загатоўка мяхоў, недастаткова энэргічна праводзіць сваю працу. Апарат Саюзхлебу працуе павольна. Так, „спец" па мяхоў прымае ў Добрушы 4000 працягу 5-6 дзён. Да гэтага прыняты мяхі, якія знаходзяцц сковых часьцях, у паасобных гас Дзякуючы націску акруговага ж жанага па рэгуляваньні транспа шыраецца праца па рамонту тым, каб штодзённа выпушчаць мяхоў.

Апроч гэтага, у паасобных ёсьць выпадкі адсутнічаньня сро расплаты з сялянамі за бульбу ку да загатоўчых пунктаў. Гэт новішча тлумачыцца тым, што Б юз авансіруе нізоўку пасьля г леньня імі дублікатаў аб адгруз бы. У выніку такой бюракратычн ноўкі ёсьць непаразуменьні. Ча тоўцы з-за адсутнічаньня грошай гуць больш шырока разгарнуць кі. Акрыванком зьвярнуў на гэ адпаведных органаў і прапанав няць захады да таго, каб нізавы тоўцы былі поўнасьцю забяс сродкамі. Палессельсаюз ужо н нізоўцы да 140 тысяч руб.

Усё гэта гаворыць аб тым, шт загатоўкі бульбы будуць поўнас кананы. Трэба толькі прыняць су меры да таго, каб на мясцох св былі дастаўлены транспартныя с

Плян будзе выканан.

(Віцебская акруга).

Па Лёзьнянскам раёну праца па загатоўцы бульбы для пралетарскіх цэнтраў пачалася з 25 кастрычніка. Была праведзена нарада загатавіцеляў. Па сельсаветах камісіі садзейнічаньня прапрацавалі пляны загатоўкі бульбы.

Па большасьці сельсаветаў гэтыя пляны даведзены да кожнай вёскі і кожнага заможна-кулацкага двара. Па 2-3 сельсаветах, далёкіх ад раённага цэнтру, гэта праца будзе праробле́на ў бліжэйшыя дні.

Усяго па раёну намечана загатовіць каля 100 тысяч пудоў бульбы.

Першыя дні даюць добрае выкананьне пляну. За 25, 26, 27 і 28 кастрычніка згодна пляну неабходна было адгрузіць 16 вагонаў. За першыя тры дні было адгружана 12 вагонаў, гэта значыць, плян быў выкан насьцю. 28 таксама дае поўну стаўку бульбы на чыгунку. А бульбы в раёну ідзе па двух ст —Лёзна і Заольша. І вось 28 наце было прызначана даставі лішкі бульбы на Заольшу, як блізкую станцыю. Але сюды па кулакі. Заказаныя вагоны на З былі поўнасьцю пагружаны. З колькасьць бульбы засталося н жанай і яе прышлося пакінуц пагрузкі на другі дзень. А на с Лёзна з гэтай прычыны адзін застаўся недагружаным.

Першыя дні загатоўкі бульб Лёзьнянскаму раёну паказалі плян будзе выканан пасьпяхова.

Ул. Бус

Уздымаем ураджайнасьць.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта);

Выконваючы пастановы партыі і ўлады аб павялічэньні ўраджайнасьці і пашырэньні пасеўнай плошчы Бабруйлічына ў пачатку 1928-29 гаспадарчага году паставіла перад сабою задачу дабіцца за адзін год павялічэньня ўраджайнасьці супроць 1927-28 году на 7 проц. і павялічыць пасеўную плошчу на 5 проц. З гэтае ўстаноўкі і выходзілі ўсе пляны аграмерапрыёмстваў і калектывізацыі вёскі.

Цяпер можна падвесьці вынікі працы па барацьбе за ўраджай. Дзякуючы шырока разгорнутай аградапамозе насельніцтву, шырокай працы па калектывізацыі вёскі, за бягучы год пляны па калектывізацыі вёскі далі сапраўднае перавышэньне на 380 проц. Было прадугледжана калектывізаваць плошчу ў 9 тысяч гэктараў, а калектывізавана 34200 гэктараў. У сучасны момант па акрузе калектывізавана 40 тысяч гэктараў зямельнай плошчы, у калгасах знаходзіцца 6 проц. двароў. Па некаторых раёнах, як напрыклад Рагачэўскаму і Жлобінскаму, асобныя сельскія саветы маюць калектывізацыю сялянскіх двароў да 40-45 процантаў.

Сёлетні год на Бабруйшчыне адзначыўся арганізацыяй буйных калгасаў. Калгас „Расьсьвет" налічвае 100 сямей і мае тысячу гэктараў зямлі. Калгас „10-ці годзьдзя Кастрычніка" мае 2500 гэкт. зямлі і звыш ста сямей. Ёсьць яшчэ шэраг буйных калгасаў. У Рагачэўскім і Жлобінскім раёнах вызначаны раёны масавай калектывізацыі.

Павялічэньню ўраджайнасьці спрыяла шырока разгорнутая праца. Так, напрыклад, у бягучым годзе зернаачышчэньне насеньня праведзена шырока, ачышчана 33536 тон насеньня. Гэтая лічба ў значнай меры перавысіла леташнія пляны і захапіла амаль што поўнасьцю ўсю колькасьць пасеўнага матар'ялу.

Перавод на шматпольле 40953 гэкт., тарфаваньне поля на плошчы ў 738 гэкт., вапнаваньне глебы, збор попелу, правядзеньне аграмінімуму, разгортваньне кантрактацыі, арганізацыя рамонтных майстэрняў,—усё гэта зьяўлялася тычнымі мерапрыёмствамі ў барацьбе ўраджай.

Да мерапрыёмстваў, спрыяючых рэньню пасеўнай плошчы і павялічэ ўраджайнасьці, трэба аднесьці свае і поўнае забесьпячэньне сялянства ным матар'ялам, машынамі, угнаі і г. д. Ня гледзячы на тое, 1928-29 гаспадарчым годзе ў акру хапала значнай колькасьці аграпрап коў (нехапала 33 проц.), вынікі б бы за ўраджай ёсьць наступныя. П ту азімаму ёсьць павышэньне ўра насьці супроць мінулага году на 10 па пшаніцы азімай—на 14,4 про пшаніцы яравой—на 7,4 проц., па ню—на 4,2 проц., па аўсу—на 14, Бульба дала павялічэньне ўраджай супроць мінулага году на 31 проц. значнае павялічэньне ўраджайнас травам. На канюшыне-сену напр гэтае павялічэньне складае 60 проц

У выніку сярэдні ўраджай на акр параўнаньні з мінулым годам, узр 50,7 проц., прычым ураджайнасьці навых культур узьнялася на 11,7

Значна ўзьняўся ўраджай у колг савгасах. Сярэдняя ўраджайнасьць ў савгасах у 1927 годзе была роўн цэнтэра, а ў бягучым годзе яна 11 цэнтнэр. Такое становішча нагля ца і па іншым зернавым культу Ураджайнасьць бульбы ў савгасах цэнтнэраў у 1927 годзе ўзрасла гучым годзе да 120 цэнтнэраў.

Паказаныя лічбы гавораць аб тым задачы партыі і ўраду па ўздыму джайнасьці выконваюцца ў строгай веднасьці з пяцігадовым плянам разь ця народнае гаспадаркі.

Д. Дамброў

Праэкт новых абмежаваньняў продажу і вырабу алкагольных напіткаў.

(АД НАШАГА МАСКОЎСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

Член ЦВК СССР і УсеЦВК т. Ю. Ларын падаў на разгляд СНК СССР праэкт новага закону аб адміністрацыйных абмежаваньнях продажу і вырабу алкагольных напіткаў.

СЫСТЭМА АБМЕЖАВАНЬНЯЎ.

Па гэтаму праэкту ўся тэрыторыя РСФСР падзяляецца на восем паясоў у адносіне разьмеру абмежаваньняў алкагольных напіткаў: першы—гарады з насельніцтвам звыш 50 тысяч чалавек (усяго 80 гарадоў) і ўсе рабочыя пасёлкі (усяго 300); другі—паласа тэрыторыі ў 15 кілёмэтраў шырыні навакол ўваходзячых у першы пояс гарадоў і пасёлкаў; трэці—тэрыторыя сельсаветаў, на плошчы якіх знаходзяцца буйныя савгасы, ці райёны суцэльнай калектывізацыі і машына-трактарных станцый; 4-ы—паласа чыгунак 5-ы—паўночная частка РСФСР, а менавіта: Мурманская акруга, Карэльская рэспубліка, Паўночная вобласьць, рэспубліка Комі, паўночныя акругі Уральскай і Сібірскай вобласьці, Якуцкая рэспубліка, Чухоцкая паўвыспа, Ахоцкае ўзьбярэжжа, Камчатка і Сахалін; шосты—райёны вінаградніцтва, а менавіта: Крымская рэспубліка, Дагенстан і акругі Паўночна-Каўкаскага краю; сёмы—іншыя гарады і пасёлкі РСФСР, апрача ўваходзячых у першы, і яты пояс; восьмы—іншыя сельскія мясцовасьці РСФСР, апрача ўваходзячых у другі, трэці, яты і шосты пояс.

Алкагольным у сэнсе праэкту новага закону прызнаецца кожны напітак, які мае ў сабе ня менш аднаго процанту алкаголю.

АЛКАГОЛЬНЫЯ НАПІТКІ.

Маючы на ўвазе што піва згуртавана для спажываньня выключна ў цэнтрах узмоцненага будаўніцтва і ня мае значэньня для барацьбы з самагонам і не зьяўляецца патрэбным для дзяржавы праэкт новага закону лічыць магчымым паступовае поўнае спыненьне вырабу піва ў працягу бягучага пяцігодзьдзя (да 1-га кастрычніка 1933 г.)

З 1-га ліпеня 1930 г. павінен быць забаронен увоз у РСФСР піва з іншых саюзных рэспублік. Прызнаецца магчымым забараніць у РСФСР выраб алкагольных напіткаў з садовіны і ягад (апрача вінаграду) з 1 ліпеня 1930 г. і забараніць з таго-ж часу іх увоз у РСФСР.

Праэкт новага закону прапануе: а) павялічыць па РСФСР кантынтент сталовай гарэлкі з 1-га красавіка да 1-га кастрычніка 1930 г. на такую колькасьць літраў, на якую выпушчана выраб баў гарэлкі—зуброўкі, каньяку і г. д. (апрача гарэлкі) з 1 красавіка да 1 кастрычніка 1929 г., б) спыніць з 1 красавіка 1930 г. выпуск усіх вырабаў гарэлкі--зуброўкі, каньяку і г. д. апрача гарэлкі; 3) забараніць з 1 красавіка 1930 г. продажу і ўвоз у РСФСР усіх вырабаў гарэлкі--зуброўкі, каньяку і г. д.—вырас якіх у РСФСР забаронен.

Выраб, продаж і ўвоз у РСФСР вінаграднаго віна, прыгатаванага са сьпірыту сам, павінны быць забаронены з 1-га ліпеня 1930 г.

Праэкт новага закону прапануе ўзмацніць прывоз вінаграду ва ўсе галоўныя рабочыя цэнтры (Масква, Ленінград, Іванава-Вазьнясенск, Тула, Ніжні-Ноўгарад і інш.) і патаніць цэны; арганізаваць выраб таннага натуральнага вінаграднага соку; значна павялічыць выраб разынак у замену імпартыруемае з-за мяжы колькасьці; пашырыць выраб з вінаграду пасьля забароны ў іх алкагольных напіткаў.

Выраб бузы, брагі і інш. дазваляецца толькі для ўласнага спажываньня ў сялянскай гаспадарцы, а продаж забараняецца на аднолькавых падставах з самагонам.

Прызнаецца неабходным зьменшыць спажываньне гарэлкі ў мясцовасьцях 1-га і 3-га пояса за пяцігодку на 100 проц. і ў мясцовасьцях 2 пояса на 50 проц. (гэта

Працу школы падпарадкуем агульна-клясавым задачам пралетарыяту ў яго барацьбе за сацыялізм.

РАЗАМ З САВЕЦКІМІ ПАРТЫЙНЫМІ І ГРАМАДЗКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ШКОЛА ПАВІННА ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У СПРАВЕ ЗАГАТОЎКІ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ.

Школа--на баявы фронт змаганьня за пісьменнасьць вясковага пралетарыяту!

Да ўсіх асьветнікаў Беларусі.

Дарагія таварышы!

Цяперашні момант Камуністычная партыя і Савецкая Ўлада мабілізавалі і мабілізуюць усю пралетарскую грамадзкасьць на давядзеньне загатоўкі хлеба і бульбы.

Гэта мабілізацыя, калгасьніці, бядняцтва і сярэдняцтва вёсні шчыра адгукнулася на заклік партыі і Савецкай Ўлады. Чырвонаармейцы, абозы і эшалёны хлеба і бульбы адзін за другім пад чырвонымі штандарамі адгукнуліся ў чырвоныя сталіцы—Маскву, Ленінград.

Гэта кампанія на ўсюды праходзіць з надзвычайным посьпехам. Шмат вясковых клясавых ворагаў—кулакоў, нэпман, іхняе агэнты, розныя спосабамі перашкаджаць партыі і Савецкай уладзе праводзіць сваю працу.

Распаўсюджваюць розныя злоснасьці чутні сярод працаўнага насельніцтва. Яны робяць напады на вясковых актывістых. Яны сваімі крымінальнымі дзеяньнямі імкнуцца сарваць загатоўчую кампанію.

Згодна кожнага саюзнага органу, кожнага асьветніка—аказаць максымальную дапамогу Камуністычнай партыі і Савецкай уладзе на сваечасовае заканчэньне загатоўчай кампаніі.

Усе саюзныя органы, кожны асьветнік павінен весьці самую шырокую расьтлумачальную працу сярод працоўнага насельніцтва, рашуча выпрывазючы ўсе маневры кулака, нэпмана і іхніх агэнтаў. Усе асьветнікі павінен быць ініцыятарам па арганізацыі чырвоных абозаў, чырвоных эшалёнаў з хлебам і бульбаю, быць арганізатарам і ўдзельнікам па збору тары—мяшкоў і інш.

У загатоўчую кампанію павінны быць шырока ўцягнуты вучні школ, нардамы, хаты-чытальні і ўсе культурна-асьветныя ўстановы.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў загатоўчай кампаніі павінна знайсьці самае шырокае месца.

Школа—з школаю, хата-чытальня — з хатай-чытальняю, раён—з раёнам у парадку сацыялістычнага спаборніцтва павінны шырока разгарнуць гэту працу.

Можны саюзны орган, кожны асьветнік павінны памятаць, што сваечасовае заканчэньне загатоўчай кампаніі—гэта яшчэ лішні крок да больш пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ніводнага Групкому, Мясцкому і Райгрупкому, ніводнага асьветніка без актыўнага ўдзелу ў загатоўчай кампаніі!

Прэзыдыум ЦП Саюзу Працасьветы ўпэўнены, што асьветнікі Беларусі свой абавязак, абавязак савецкага асьветніка па ўдзелу і ў гэтай кампаніі выканаюць з гонарам і сваёю актыўнаю працаю ў загатоўчай кампаніі дапамогуць Камуністычнай партыі і Савецкай уладзе праводзімую загатоўчую кампанію закончыць сваечасова і з посьпехам.

З таварыскім прывітаньнем:

Прэзыдыум ЦП саюзу Белпрацасьветы.

Школы—на дапамогу хлеба і бульбазагатоўкам.

Адной з самых адказных задач камуністычнай партыі, органаў савецкай улады і ўсёй савецкай грамадзкасьці цяперашні момант зьяўляецца сваечасовая загатоўка хлеба і бульбы. Сваечасовае і акуратнае выкананьне гэтае задачы вельмі важнае паліт. і эканамічнае значэньне: забясьпечаньне рабочых буйных прамысловых раёнаў харчамі, правільнае і плянавае разьмеркаваньне хлебных запасаў, барацьба з спэкуляцыяй, з узьвышэньнем цэнаў і г. д. Сваечасовае выкананьне загатовак хлеба і бульбы — задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў его практычным ажыцьцяўленьні; сваечасовае выкананьне гэтае задачы—моцны ўдар па прыватніку, кулаку.

Вялікая частка ў вёсцы ўсімі сіламі стараецца перашкодзіць, падарваць і затрымаць ход загатоўчае кампаніі. Тым больш увагі на гэту вельмі важную справу, ад якой будзе залежаць у значнай меры і выкананьне нашага пяцігадовага пляну, павінны зьвярнуць увагу ўся наша савецкая грамадзкасьць.

Вялікія задачы ў гэтай справе ставяцца на нашы школы, якія маюць прымаць актыўны ўдзел ва ўсім грамадзкім жыцьці і ў той клясавай барацьбе, якая адбываецца і будзе адбывацца ў перыяд дыктатуры пралетарыяту, у перыяд наступу савецкага на капіталістычныя элемэнты вёскі.

Вось-ж канкрэтна павінны і могуць зрабіць школы ў справе дапамогі правядзеньню загатовак хлеба і бульбы? Школы павінны перш за ўсё неадкладна растлумачыць усяму бядняцка-сялянскаму і сярэдняцкаму насельніцтву сваёй вёскі значэньне правядзімай кампаніі, яе тэрміновасьць. Для гэтага сумесна з камсамольскімі арганізацыямі трэба правесьці спэцыяльныя сходы, паладзіць гутаркі. Трэба так паставіць справу, каб кожны вучань стаў актывным правадніком і штурхачом здачы хлеба ў сваёй і суседніх гаспадарках. Школа павінна ў пасьпеннай газэце высьвятляць ход хлебазатовак у сваім раёне, сельсавеце, населішчы, адзначаць посьпехі, недахопы, перашкоды і асабліва выяўляць перашкоды з боку кулацтва.

Школа можа і павінна мабілізаваць грамадзкую думку беднякоў і сярэднякоў каля задач загатовак хлеба і бульбы. Школы могуць зьвяшчаць ініцыятарамі агранізацыі чырвоных абозаў сваёй вёскі, насёлку, калгасу. У справе арганізацыі дастаўкі хлеба і бульбы бядняцкімі гаспадаркамі, якія ня маюць коні, школы таксама могуць прыняць належны удзел, дагаварыўшыся з сельсаветам, ці камітэтам, які спэцыяльна для гэтай мэты можа быць арганізаваны ў вёсцы.

Задачай нашай савецкай школы зьяўляецца падрыхтоўка падрастаючага пакаленьня да практычнага будаўніцтва сацыялізму, таму ўдзел у хлебазагатоўках дасьць школе добрую практыку ў гэтым будаўніцтве.

В. С.

ВЫКОНВАЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА.

Верасьня г. г. Плешчаніцкая сямігодовая школа (Менскай акругі) заключыла ўмову аб сацыялістычным спаборніцтве з Лагойскай сямігодкай. Асноўныя ўмовы ідзе шпаркім тэмпам наперад. Вось канкрэтныя дасягненьні ў выкананьні асобных пунктаў умовы:

1) Усе школы падпісаліся на трэцюю пазыку індустрыялізацыі на 205 руб.

2) Выпісана газэта з разьлікам адна газэта на кожна вучня ў старэйшым канцэнтры і адна газэта на двух вучняў у малодшым.

Заключана пэраг умоў сацыялістычнага спаборніцтва паміж паасобнымі групамі школы.

Кожная група старэйшага канцэнтру бярэ шэфства над аднэй з вясковых школ.

Плешчаніцкая сямігодка праз „Савецкую Беларусь" выклікае школы іншых райёнаў на абмен вопытам аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва.

Я. Меніч.

СУМНЫЯ БУДНІ МАГІЛЕУСКАГА БЕЛПЭДТЭХНІКУМУ.

Старыя пагудкі на новы лад.

Патрэбна ўмяшацельства Наркамасьветы.

У Магілеве ўсім вядома пра яры зажым самакрытыкі ў пэдтэхнікуме, ёсьць-тое ведаюць і пра «парадачкі» ў ім наогул... Хіба не характэрным доказам гэтага зажыму зьяўляецца абураны званок у рэдакцыю мясцовае газэты дырэктара т. Хомо, калі ў газэце зьявілася заметка пра антысэмітызм у сьценах тэхнікуму:

— Як-так? Дык як вы маглі зьмяшчаць заметку? А вы ўзгадзілі, увязалі, давялі да ведама?...

ШТО БЫЛО ДАГЭТУЛЬ?

Старое кіраўніцтва тэхнікуму, яго навучальная частка, плыло бяз руля і без вятрыл.

У свой час была з'арганізавана пры тэхнікуме надта добрая біо-станцыя з рэдкімі калекцыямі і экспанатамі, з-за нядбайнасьці загадчыка станцыі Мярцалава рыбы і жывёлы тамака паздыхалі.

Біо-станцыю прышлося ліквідаваць. Гэта каштавала Галоўпрафасьветы каля 5000 рублёў...

На працягу трох год прыродазнаўства выкладаў настаўнік Арлоў—славуты п'яніца (бліжэйшую піўную студэнты так і зваві: «арлоўка»), расійскі шавіністы і дэмагог.

Сярод студэнтаў цьвілі есэнінскія настроі, хуліганства; зарэгістраваны выпаткі замахаў на самагубства, некаторыя студэнты (Бардзівіч) атрымлівалі ў характэрыстыках пры выпуску адзнакі: «антысэміт»...(!).

У агульным памяшканьні былі нацыянальныя групоўкі па пакоях, анархізм у быту. Комсамольская ячэйка не карысталася абсалютна ніякім аўтарытэтам...

НОВЫЯ ЛЮДЗІ—СТАРЫЯ ПЕСЬНІ..

Сёлета абнавілі ў пачатку навучальнага году процантаў на 40 склад выкладчыкаў і адміністрацыі.

Але засталіся старыя пагудкі на новы лад.

У асяродзьдзі студэнцтва вырас адкрыты антысэмітызм. Першы курс пачаў цкаваньне курсанта-яўрэя Лермана, абзываючы яго «Троцкім», «жыдам», піхаючы яго і г. д. Даведзены выдзекамі да адчаю, Лерман папоў скардзіцца „на свой лёс" у пэдтэхнікуме да рэдакцыі мясцовае газэты „Магілёўскі Селянін". Калі ўзьнялі праз друк пытаньне аб выключэньні з ліку студэнтаў актыўнага хуліганантысэміта Арлоўскага (ініцыятара зьдзекаў з Лермана), дык пэдсавет на сваім пасяджэньні стаў на абарону хулігана, праваліўшы прапанову ячэйкі КП(б)Б аб яго выключэньні.

Па агульным памяшканьні ўсіх курсаў ходзяць брудныя «яўрэйскія» анэкдоты і інш. Да рэчы, сёлета выключылі з комсамолу за антысэмітызм сябра бюро калектыву КСМ тэхнікуму.

Надоечы выявілася, пта сёлета быў прыняты ў тэхнікум „беднячок", бацька якога плоціць у індывідуальным парадку падатку 500 р. (Г. Блянка).

„ДРОБЯЗІ" БЫТУ.

17 студэнтаў гэтымі днямі ўтварылі „фурор". Яны з хэмічнае лябараторыі сьцягнулі 2 вядры сьпірту і напіліся, узьняўшы дэбош, роўнага якому ня прыпомніць стары Магілеў... Краджеж наогул звычайная зьява ў тэхнікуме... «Цягнуць» паліто, кажушкі, гатавальні, жніжкі...

У памяшканьні былой біо-станцыі жывуць студэнты-першакурсьнікі, жывуць у немажлівых умовах, сьпяць на падлозе, без тапчаноў, памяшканьне амаль зусім не апальваецца.

Зьнізілася і акадэмічная пасьпяховасьць. Зьнік чамусьці дальтон-плян, зьмяніўшыся звычайнымі, сухімі лекцыямі. Гінне вучоба...

Нядаўна, па нядбайнасьці выкладчыка хэміі, у часе досьледаў асьлепла студэнтка другога курсу.

ЧАКАЕМ УПАРАДКАВАНЬНЯ.

Усе пералічаныя факты сьведчуць шмат аб чым:

Аб недастатковым кіраўніцтве партячэйкі тэхнікуму яго жыцьцём, аб сумным становішчы інтэрнацыянальна-камуністычнага выхаваньня, аб крывісе адміністраваньня ў тэхнікуме і г. д.

З жалезнай непаўпушчальнасьцю з гэтых фактаў выплывае адно:

— Тэхнікум павінен аздаравіцца.

У наш час, калі гэтак завострана пытаньне кадраў, пэдтэхнікум павінен быць сапраўдным кузьняй, адкуль будуць выходзіць чырвоныя настаўнікі, марксыцкі-загартаваныя будаўнікі новае, сацыялістычнае вёскі.

Белы будынак ва Быхаўскай павінен забураніць іншым жыцьцём, непераможнай прагнасьцю да перамог.

Юрка Лявонны.

ПЭДАГОГІ З МЯШЧАНСКІМ ДУШКОМ.

Агідная склока паміж настаўнікамі 5-ай менскай гарадзкой сямігодкі.

Пачынаючы з кастрычніка месяца 1928 г., паміж настаўнікамі нулявых груп 5-й менскай 7-мігадовай школы пачаліся мяшчанска-абывательскія ўзаемаадносіны. Замест прышчапленьня дзецям калектыўнасьці, самі настаўніцы былі жывым прыкладам разьвіцьця ў дзяцей „псыхолёгіі сэпаратызму". Дзеці на прыкладах настаўніц добра ўцямілі: „гэта кляса наша, гэта лёто наша, а ня ваша" і г. д. Бачыце, адна кляса прахадная—вось тут увесь корань зла. Рабаты праходзілі ў галёшах. Пачынаюцца размовы, справа даходзіць да пэдрады. Выносяцца рашэньні аб мяшочках для галёш, але як быць тым, у каго няма галёш? Справа ясная —боцікі ў торбачку і басячком.

Настаўніцы пры дзецях і бацькох (шмат выпадкаў) заціскаюць спрэчкі. На адным з ранішнікаў у прысутнасьці дзяцей і бацькоў адна з іх крычала на другую: „Якое права вы маеце тут распараджацца". Была і такая сцэнка: дзяўчынка падышла да выхавацельніцы і сказала: „Цёця, з вашае полкі дзеці іноў бралі кнігі". Адказ: „скажы сваёй настаўніцы". І калі дзіцянё другі раз зьвярнулася да „цёці",—пашла пісаць губэрская—да падругі; у гэты дзень—плёткі! Гадка, нізка, гразна, подла. Кепскіх дзетак няма, ёсьць кепскія пэдагогі.

Спрэчкі, размовы ахапляюць увесь калектыў школы. Узмацняецца „дзелавая справа". Горш, калі з супольнае шафы 2-х групаводак прападае 2 рублі.

З боку аднэй робяцца спасылкі на другую. Адна наступае, другая абараняецца. Зьбіраецца ў другі раз школьная рада. Затрачаюцца гадзіны на „палепшаньне школьнага жыцьця". Выносіцца пастанова аб пераводзе абедзьвюх сварлівых настаўніц у іншыя школы. Працуе камісія з 5 асоб настаўнікаў. У склад камісіі ўваходзіць галава школы Ксяжнук, які характарызаваў гэту справу „маленькая шахцінская справа ў школе". Камісія дапускае неабгрунтованую дыскрэдытацыю настаўніцы Воранавай, абвінавачваючы яе ў прысваеньні вучнёўскіх грошай —„нявысьветленая пранажа грошай у клясе кідае цэнь на таварыша Воранаву... Новы збор грошай таксама ставіць яе ў нягодную становішча" і г. д. (з акту камісіі). Праўда, актам адзначаны недахопы, прыкладна—„Лічыць у вышэйшай ступені недапусцімым зьявішчам палаваньне рукі т. Паўлоўскай яе мужам у мурох школы. Устаноўлен рэзкі выпад з боку Воранавай да Гурыновіч" і г. д.

Камісія робіць вынік, каб настаўніц нулёвак Інспэктарыят Нар. Асьветы з пачатку новага навучальнага году перавёў у іншыя школы. Групком дае згоду на перавод толькі Воранавай.

Дзе быў гарадзкі інспэктар, куды ён глядзеў і чым думаў?

Была і самая што ня ёсьць бюракратычная валакіта. Прыводзіць літаральна.

„Т. ВОРОНОВОЙ.

В виду поступающих заявлений родителей об отпуске вам денег на закупку книг и другие нужды, и на что эти деньги израсходованы неизвестно, предлагается вам в 3-х дневный срок представить все денежные счета на что израсходованы и списки поступлений от родителей.

Зав. школой ИСЕНЖУК".

12 апреля 1929 г., № 58.

Тут для Воранавай сапраўды абставіны, што яна ўкрала гроны. Калі яна прынесла рахункі, заг. школай кажа: „Калі-б гэтыя рахункі перадаць сьледчаму"... Так часткай і думаў калектыў. Воранава адмаўляецца ад пераходу ў іншую школу, рэабілітуе сябе тут.

Зьбірае ад бацькоў падпіскі. Вось абразчык надрукаванай загадзя заявы:

„По дошедшим до нас сведениям, учительницу Александру Александровну Воронову обвиняли на школьном совете в том, что она в прошлом году собирала о родителей учащихся во вверенном ей классе деньги на тетради и карандаши, и на тетрадей ни карандашей детям не давали и что она собирала на книги по 2 р. 50 коп., а книжку давала на 18 коп."

„Мы заўважаем, што гэта няпраўда... Воранава ўпаўне спраўлялася са сваёй работай, удзяляла максымум увагі справе выхаваньня дзяцей". Далей ідзе сабраных 7 подпісаў бацькоў. І так з кастрычніка 1928 году па кастрычнік 1929 году пісалі, гутарылі. Праўда, уся справа пакуль што на 24 лістох.

Якія-ж можна зрабіць вывады з гэтае брыдкае справы? Адсутнічала кіраўніцтва школай, бо ня было адпаведнага кіраўніка, які-б сваечасова, як загадчык, рэагаваў і выравіў пытаньне, як належыць пэдагогу, адміністратару. Не адчувалася кіраўніцтва з боку гарадзкога інспэктара.

Ці былі скарыстаны ўсе захады для таго, каб наладзіць нармальную працу ў нулёўках? Арганізавана гэта ня было праведзена. У выніку ўсё гэта адбілася на выхаваўчай частцы і працы школы наогул.

НК РСІ вынес наступную ў асноўным пастанову:

Заг. школай Исенжука за несваечасовае і няправільнае рэагаваньне на недапусцімыя зьявішчы ў школе і г. д. з працы загадчыка зьняць.

Гарадзкому (былому) інспэктару Пісарчыку абвясьціць вымову, аўдзіўшы дзейчасьць школьнае камісіі.

Улічыўшы, што паводзіны настаўніц нулявых груп насілі зьмест не як пэдагагічны, а як бясспрыцыпна мяшчанскі, без уліку школы, якая адбілася ў адмоўны бок на выхаваньні дзяцей, з прычыны слабай сьвядомасьці гэтых настаўніц у справе запатрабаваньняў савецкае пэдагогікі і наогул жыцьця і працы савецкае школы,—катэгарычна папярэдзіць настаўніц нулёвак, што ў будучым падобныя зьявішчы з іх боку настаўніц пытаньне аб іх зьняцьці.

Прапанавана Акр. ІНА т. Ермакову прыняць пэраг захаду на аздараўленьні працы і жыцьця 5 школы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падбор настаўнікаў і ўзмацненьне вучэбна-выхаваўчай працы ў школе.

Перад ІНА стаіць актуальная задача—перагляд настаўніцтва гораду Менску. Менск перапоўнен. Грызьня ідзе таксама за нагрузку ў той час, калі ў райёнах не хапае працаўнікоў. Менск павінен укамплектоўвацца, як і іншыя акруговыя гарады. Не павінна быць месца склокам у школе!

Настаўнік.

Навучым 50.000 вясковых пралетарыяў!

Усім АВК, АКРАНА, АК ЛКСМБ і акругкомам саюзу СГЛР.

Для ўзмацненьня пралетарскага ўплыву і арганізуючай ролі сельгаслесрабочых у сацыялістычным будаўніцтве на вёсцы, для забясьпечаньня яшчэ большага прытоку сельгаслесрабочых у шэрагі кампартыі, камсамолу і прафсаюзу, нам неабходна наладзіць справу клясавага выхаваньня шырокіх мас батрацтва. Самай асноўнай перашкодай у гэтай справе зьяўляецца няпісьменнасьць і малапісьменнасьць вясковых пралетарыяў. Пагатаму асноўваю задачаю ў справе ўцягненьня сельгаслесрабочых у актыўнае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва на вёсны зьяўляецца зьнішчэньне няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод шырокіх мас батрацтва і ўвязка гэтае работы са справаю клясавага выхаваньня сельгаслесрабочых. На 29-30 навучальны год намечана ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць сярод 50.000 сельгаслесрабочых.

Для выкананьня гэтае задачы паміж саюзам Сельгаслесрабочых і НК Асьветы заключана ўмова, згодна якое НК Асьветы, пры матар'яльнай дапамозе саюзу, абавязуецца на працягу навучальнага году абучыць 50.000 няпісьменных і 4.300 малапісьменных. Для гэтага патрэбна арганізаваць каля 3000 спэцыяльных батрацкіх ліквпунктаў і каля 1000 груп малапісьменных.

Гэта задача можа быць з посьпехам выканана толькі тады, калі будзе праведзена належная арганізацыйная падрыхтоўка, калі ўсе савецкія і камсамольскія арганізацыі будуць актыўна дапамагаць саюзу і Наркамасьветы ў гэтай рабоце.

У сувязі з гэтым Арганізацыйны Аддзел Прэзыдыуму ЦВК, Наркамасьветы, ЦК ЛКСМБ і ЦП Сельгаслесрабочых прапануюць:

1) Для арганізацыі работы па зьнішчэньню няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод сельгаслесрабочых і садзейнічаньня ў гэтай рабоце, пры с-саветах арганізаваць камісіі з прадстаўнікоў с-савету, с-рабачкому, яч. ЛКСМ і настаўніка. Старшынёю камісіі зьяўляецца старшыня, або сэкратар с-савету.

2) На камісіі ўскладаецца работа па правядзеньню вучоту няпісьменных і малапісьменных батракоў, батрачак і сельгаслесрабочых, арганізацыі ліквпунктаў і груп, разьмеркаваньне няпісьменных і малапісьменных па ліквпунктах, арганізацыя індывідуальнага навучаньня батракоў, нагляд за работай ліквпунктаў, арганізацыя выпуску з ліквпунктаў і падвядзеньне вынікаў гэтае работы.

3) Вучот няпісьменных і малапісьменных утвараецца па спэцыяльна распрацаванай вучотнай картцы. Запоўненыя вучотныя карткі няпісьменных і малапісьменных батракоў і с-гаслерабочых перадаюцца настаўніку таго ліквпункту, або групы, да якой прымацаваны няпісьменны, або малапісьменны. Калі няпісьменны або малапісьменны батрак пасьля разрахунку з наймальнікам пераходзіць у іншы раён, або с-савет, дык вучотная картка перасылаецца ў адпаведны с-савет. На падставе вучотных картак складаюцца па с-саветах сьпісы няпісьменных і малапісьменных у 2-х паасобніках, пры чым адзін сьпіс застаецца ў камісіі, а другі накіроўваецца с-рабачкомам у акруговы камітэт саюзу СГЛР.

4) Усю тэхнічную работу па вучоту няпісьменных і малапісьменных сельгаслесрабочых і па складаньню сьпісаў праводзяць ячэйкі камсамолу ў парадку дапамогі прафсаюзу СГЛР.

5) Настаўнік ліквпункту, атрымаўшы карткі няпісьменных і малапісьменных, прымацаваных да яго ліквпункту, разам з с-рабачкомам арганізоўвае работу ліквпункту і па картках адзначае наведваньне ліквпункту і пасьпяховасьць навучаемага.

6) Камісія па зьнішчэньню няпісьменнасьці сярод батрацтва працуе на працягу ўсяго навучальнага году, правярае работу ліквпунктаў, вывучае прычыны ненаведваньня ліквпункту, непасьпяховасьць навучаемых і прымае меры да ўхіленьня гэтых прычын. У выпадках, калі наймальнікі ня будуць пушчаць батракоў на ліквпункты, камісія пры с-с прымае належныя меры ўзьдзейнічаньня на наймальнікаў.

7) У канцы навучальнага году камісія арганізоўвае выпуск няпісьменных і малапісьменных з ліквпунктаў і падводзіць вынікі ўсяе работы. Сельгаслесрабочым, скончыўшым ліквпункты, выдаецца адпаведнае пасьведчаньне.

8) Ліквпункты і групы праводзяць работу на беларускай мове, а там, дзе ёсьць сельгаслесрабочыя іншых нацыянальнасьцяў (яўрэйскай, польскай і інш.), ліквпункты працуюць на іхнай роднай мове.

9) АКРАНА, АК ЛКСМ і акругкомы саюзу абавязаны сыстэматычна правяраць выкананьне гэтых дырэктыў і наогул пастаноўку работы па зьнішчэньню няпісьменнасьці сярод сельгаслесрабочых, праз абсьледваньні і заслухоўваньне дакладаў аб рабоце самых нізавых арганізацый.

Агітацыйны аддзел Прэзыдыуму ЦВК, НК Асьветы, ЦК ЛКСМБ і ЦП сельгаслесрабочых упэўнены, што важнейшая задача зьнішчэньня няпісьменнасьці сярод вясковага пралетарыяту будзе выканана.

Заг. арганізацыі Прэзыдыуму ЦВК БССР *А. Лукашэвіч.*
Наркамасьветы БССР Платун.
Старшыня ЦП СГЛР Вайтэнкаў.
Сэкратар ЦК ЛКСМБ Галавач.

Разгарнулі дапамогу бяднейшым вучням.

(1-я Чэрвенская белар. 7-годка).

У гэтым годзе, дзякуючы сталаму сацыяльнаму адбору, вучняў-беднякоў у школе—як ніколі. Выходзячы з гэтага становішча, агульны калектыў усіх школ гораду разам з грамадзтвам, утвараючы спэцыяльны камітэт дапамогі бяднейшым вучням школы, прышоў к наступнаму: напершае, утвораны камсад у параўнаньні з леташнім годам павінен разгарнуць сваю працу яшчэ шырэй, прыцягваючы да гэтай справы працоўнае грамадзтва; падругое, старацца стварыць як мага большы фонд дапамогі, і патрэцце забясьпечваць ня толькі грашыма, але ўсім тым, без чаго вучань-бядняк ня можа нармальна вучыцца: прыладамі, абуткам, харчамі, інтэрнатам і інш.

Беларуская 7-годка ў напрамку збору сродкаў ужо шмат чаго зрабіла. Праведзены 2 суботнікі па капаньню бульбы ў бліжэйшым савгасе, што дало 170 руб. Праведзен бацькаўскі сход, які таксама згадзіўся на дапамогу. Кожны бацька павінен унесьці ў фонд дапамогі ня менш рубля, што складзе каля 500 руб. Мяркуецца выпусьціць падпісны ліст сярод настаўніцтва школы

У. Дземяшкевіч.

ПРАЦОЎНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў 30 МЕНСКАЙ ШКОЛЕ.

30-я менская працоўная школа налічвае 5 вытворчых гурткоў; з іх—2 пераплётных, 2 сталярных і 1 гурток работы па мэталю. Пераплётныя і сталярныя гурткі працуюць з 15 верасьня, гурток на мэталю—з 1 кастрычніка. Сталярныя і пераплётныя гурткі маюць пры школе сваё абсталяваньне, а гурток па мэталю скарыстоўвае варштаты стройвучу. Усімі гурткамі кіруюць рабочыя - спэцыялісты.

Ва ўсіх гурткох працуе каля 60 вучняў старэйшых клясаў, пачынаючы з 4 клясы. Сталярныя гурткі ўжо досыць добра наладзілі працу. Яны нават узялі заказ на 50 табурэтак, выручаныя сродкі будуць скарыстаны на абсталяваньне гурткоў. Пераплётныя гурткі пераплятаюць школьныя кнігі.

Пераважна гурткі складаюцца з хлопцоў. Дзяўчат-вучаніц у гэтых гурткох мала.

Бацькі вучняў вельмі здаволены, што адначасова з агульнай адукацыяй іхных дзяцей навучаюць і рамяству. Пажадана было-б, каб пры школе былі і такія гурткі, як швейны гурток, гурток ручной працы і г. д., у якіх прымалі-б удзел і дзяўчаты.

Турэцкая.

Абавязковае навучаньне—агульна-грамадзкая справа.

Пачынаючы з 1929-30 году ў БССР пачынае абавязковасьць навучаньня дзяцей 8-гадовага ўзросту. Гэта ўвядзе новую эпоху ў культурным жыцьці БССР, пачынае сапраўднае ажыцьцяўленьне культурнай рэвалюцыі.

Пры працягу цэлых стагодзьдзяў царская ўлада трымала працоўны народ усі ў цемры. Беларусь была саўсім адсталай краінай у адносінах пісьменнасьці насельніцтва і пашырэньня школьнай асьветы. У сучасны момант стаіць на першым месцы сярод іншых саюзных рэспублік у справе дасягнага павялічэньня пачатковай школьнай асьветы: на 100 душ насельніцтва, па даных школьнага попісу 1927-28 году, прыпадае вучняў: па Украіне—8,5, у РСФСР—6,7 у УССР—6,2, у ЗСФСР—7,8, па ўсяму СССР—6,7. Як піша газэта «Правда» (№ 211, ад 11 верасьня г. г.), у артыкуле тав. Ніка, адзначана, што толькі ў БССР, зараз пасьля дырэктыў Саўнаргаду Саветаў СССР, хутка пераняла свой плян усеагульнага навучаньня (папярэдні плян быў разьлічаны на канчатковае ажыцьцяўленьне агульнага навучаньня ў 1934-35 г., падрыхтавалася за лета 28-29 год і атрымала магчымасьць правесьці ўсеагульнае навучаньне, пачаўшы з 29-30 навучальнага году. Цяпер ўрад ужо зрабіў пастанову аб ходзе БССР у справе ўсеагульнага навучаньня з саюзнага бюджэту 1929-30 году.

Праз чатыры гады ў 1932-33 годзе ў БССР ніводнае дзіцянё школьнага ўзросту (8—11 год) ня будзе па-за школай. Толькі з канчатковым ажыцьцяўленьнем школьн. абавязковага навучаньня будзе грунтоўна зьнішчанага няпісьменнасьць і дарослага насельніцтва, бо да гэтага часу и ада на ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых у значнай ступені паралізавалася папаўненьнем кадраў няпісьменных з падросткаў, якія не прайшлі праз нармальную пачатковую школу.

Пастанова Савету Народных Камісараў аб абавязковасьці навучаньня цягне за сабою, як вынік, вялікае кольчаснае пашырэньне школьнай асьветы ў наступныя чатыры гады. Усяго патрэбна будзе адчыніць новых 5340 школьных камплектаў, гэта значыць павялічыць існуючую колькасьць камплектаў (9575) на 55 пр. Колькасьць вучняў павялічыцца ў працягу наступных чатырох год з 434.000 да 597.000 (на 38 проц.), пры зьмяншэньні нагрузкі настаўнікаў з 45,5 да 40 вучняў на камплект. За 5-годзьдзе павінна быць пабудавана 2500 новых будынкаў двухкамплектных школ. Дзеля ажыцьцяўленьня гэтага пляну ў 1929-30 навучальным годзе ўжо адчыняецца 1335 новых школьных камплектаў і будуць будавацца будынкі для 964 камплектаў.

Абавязковае абавязковасьці навучаньня адаб'ецца ня толькі на колькасным павялічэньні пачатковай школьнай асьветы, але і на якасным палепшаньні школы. Абавязковасьць навучаньня праводзіцца ня толькі ў сэнсе абавязковасьці пасылкі дзяцей у школу, але і ў сэнсе абавязковасьці наведваньня дзецьмі школ на працягу ўсяго навучальнага году і на працягу ўсіх чатырох год навучаньня ў першым канцэнтры працоўнай школы. За несваечасовае, бяз уважлівых прычын, пакіданьне вучнямі школы да канца навучальнага году і да канца навучальнага курсу бацькі і апякуны тых вучняў будуць прыцягвацца да адказнасьці, таксама як і за непасылку дзяцей у школу.

Фактычны працяг навучальнага году ў вясковых школах, па даных школьнага перапісу, раўняецца 157 дням. У параўнаньні з дарэвалюцыйным часам, гэты працяг значна павялічыўся (да рэвалюцыі ён быў 120-130 дзён), але і ў сучасны момант ён яшчэ далёкі ад нормы—180-190 дзён. У бягучым навучальным годзе з боку Народнага Камісарыяту Асьветы і яго органаў на мясцох прыняты рашучыя меры да таго, каб заняткі ў пачатковых вясковых школах пачыналіся ў верасьні месяцы і можна думаць, што кампанія гэта дасьць далейшыя дадатныя вынікі. Працягласьць навучальнага году значна павялічылася-б, калі-б зьнішчыць тыя перапынкі ў заняткох, якія часта яшчэ бываюць у нашых вясковых школах. Па даных школьнага попісу, у 27-28 г. у школах БССР было прапушчана 34260 навучальных дзён, што на адну дасьледаваную школу дае каля 11 навучальных дзён. Большасьць пропускаў нельга прызнаць уважлівымі: адсутнасьць апалу ў школах, удзел настаўнікаў у канфэрэнцыях, грамадзкая праца настаўнікаў у гадзіны вучэбных заняткаў і інш.

Дрэнна яшчэ стаіць справа і **з фактычным працягам навучальнага курсу ў вясковых школах.** У сярэднім вясковыя дзеці вучацца толькі 2,6 года замест чатырох год, прычым хлопцы вучацца ў сярэднім 2,8 года, а дзяўчаты—толькі 2,1 года. У параўнаньні з дарэвалюцыйным часам, працягласьць навучальнага курсу пачатковай школы значна павялічылася (да рэвалюцыі яна складала толькі 1,8 года), але і ў сучасны момант яна яшчэ вельмі незначна, што, вядома, адбіваецца на якасьці прадукцыі школы.

Вялікі адсеў вучняў пачатковых школ прадстаўляе сабою ненармальнае зьявішча ня толькі ў пэдагагічных адносінах, ён мае і выразна клясавы характар; напр., данныя школьнага попісу кажуць, што да чацьвертай групы даходзяць толькі 28 проц. дзяцей сялянскай беднаты і сярэднякоў; дзяцей больш заможных сялян даходзіць да чацьвертай групы 38 проц., рабочых—54 проц., у той час, як процант дзяцей служачых у чацьвертай групе павялічваецца да 76, а асоб вольных прафэсій—да 100 проц. Паўстае, такім чынам, перад школай і грамадзтвам вельмі актуальнае пытаньне—як затрымаць дзяцей беднаты да канчэньня ўсяго курсу школы. Абавязковасьць навучаньня ў сэнсе абавязковасьці наведваньня школы ў працягу ўсяго навучальнага году і ўсяго навучальнага курсу можа быць зьдзейснена толькі ў тым выпадку, **калі дзецям беднаты будзе дадзена фактычная магчымасьць вучыцца ў школе.**

Неабходна арганізаваная матар'яльная дапамога дзецям беднаты як з бюджэтных сродкаў, так і з боку грамадзтва. З бюджэтных сродкаў такая дапамога пачала аказвацца ўжо з 1927-28 году: у 1927-28 годзе было асыгнавана па бюджэту на гэту справу 50.000 рублёў, у 28-29 годзе—142000 рублёў, у 29-30 годзе маркуецца адпусьціць з мясцовых бюджэтаў—470 т. рублёў. Але зразумела, што гэтымі бюджэтнымі асыгнаваньнямі абмежавацца нельга. Для правільнага і рацыянальнага скарыстаньня бюджэтных сродкаў і для прыцягненьня на дапамогу дзецям батракоў і беднаты ініцыятывы і сродкаў насельніцтва, трэба арганізаваць з наступнага навучальнага году пры ўсіх школах камітэты садзейнічаньня школе. Гэтыя камітэты павінны клапаціцца аб зборы сродкаў і аказваць дапамогу дзецям беднаты вопраткай, абуткам, арганізацыяй гарачых сьніданьняў, падвозам дзяцей у школу, выдачай падручнікаў, пісьмовых прылад і г. д. Разам з гэтым павінна быць арганізавана ў школах і пэдагагічная дапамога дзецям беднаты ў прахаджаньні імі навучальнага курсу: настаўнікі павінны прымацаваць больш здольных у заняткох вучняў да больш слабейшых з мэтай дапамогі ім у заняткох.

Павялічэньне навучальнага году і навучальнага курсу, матар'яльная і пэдагагічная дапамога дзецям беднаты павінны палепшыць прадукцыю пачатковай школы і, у прыватнасьці, павінны зьменшыць лік другагоднікаў. У сучасны момант гэты лік вельмі значны—19,8 проц. агульнага ліку вучняў, пры чым у гарадох гэты процант значна меншы (15,1 проц.), чым у вясковых мясцовасьцях (21,1 проц.).

Трэба зьменшыць процант другагоднікаў да канца 5-годкі да 10. Гэта вымагаецца, апроч пэдагагічных матываў, неабходнасьцю выкананьня пляну ўсеагульнага навучаньня. Кожны другагоднік займае месца ў школе і не дае магчымасьці займаць гэта месца дзіцяці нармальнага школьнага ўзросту. Калі проц

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР.

ПА ДАКЛАДУ ПРЫЁМНАЙ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ

Заслухаўшы даклад тав. Дубаўцова аб дзейнасьці Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК БССР, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

1. Работа Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК па характару, зьместу і форме сваёй спрыяла ўстанаўленьню шырокай сувязі з працоўнымі масамі, асабліва вёскі, аб чым сьведчыць значная колькасьць наведваньняў Прыёмнай за параламі, з заявамі, скаргамі і хадайніцтвамі па розных пытаньнях і справах. Вырашэньне гэтых заяў, скарг і хадайніцтваў ад рабочых і працоўных сялян Прыёмнай праводзілася правільна. Адмоўна адбівалася на рабоце Прыёмнай загрузка яе такімі скаргамі і хадайніцтвамі, якія павінны і могуць быць вырашаны мясцовымі органамі ўлады і ўстановамі;

2. Поруч з гэтым Прэзыдыум ЦВК адзначае недастатковае выкананьне Прыёмнай раней дадзеных ёй Прэзыдыумам ЦВК дырэктыў аб вядзеньні дасканалага вучоту наведвальнікаў па сацыяльнаму складу; аб пэрыядычным падагуленьні па катэгорыях спраў, па якіх наведвальнікі зварочваюцца ў Прыёмную; аб увязцы працы Прыёмнай з рэдакцыямі газэт для асьвятленьня станоўчых і ў асаблівасьці адмоўных момантаў у працы органаў улады пры вырашэньні спраў прыватных асоб і грамадзкіх арганізацый.

Для палепшаньня ў далейшым пастаноўкі работы Прыёмнай, Прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК:

а) разам з Сакратарыятам Прэзыдыуму ЦВК наладзіць вывучэньне паступаючых у прыёмную ЦВК хадайніцтв, скарг і заяў пад пунктам погляду адшуканьня прычын, выклікаючых гэтыя скаргі, заявы і хадайніцтвы і вызначэньня мерапрыемстваў для ліквідацыі гэтых прычын;

б) арганізаваць дакладны кантроль за своечасовым выкананьнем тых скарг, хадайніцтв і заяў, якія перадаюцца на вырашэньне іншым установам;

в) завесьці сталы вучот сацыяльнага складу ўсіх наведвальнікаў, якія зварочваюцца ў Прыёмную Прэзыдыуму ЦВК.

г) практыкаваць у працы Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК рэгулярнае скліканьне нарад прадстаўнікоў наркаматаў і цэнтральных устаноў для хутчэйшага папярэдняга вырашэньня больш важных спраў, якія маюць дачыненьне да дзейнасьці гэтых наркаматаў і ўстаноў;

д) пэрыядычна асьвятляць у газэтах работу Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК, вызначаючы найбольш шырока фактыі праявы бюракратызму, цяганіны і скрыўленьня клясавай лініі, якія дапушчаюцца як цэнтральнымі, так і мясцовымі органамі ўлады і ўстановамі ў справе абслугоўваньня рабочых і працоўных сялян;

е) забясьпечыць пакой у Прыёмнай, у якім зьбіраюцца і чакаюць наведвальнікі свайго прыёму, адпаведнай папулярнай літаратурай і газэтамі для чытк і.

2. Даручыць НК РСІ праверыць пастаноўку работы ў цэнтральных органах і ўстановах у справе прыёму наведвальнікаў і вырашэньні іх хадайнічаньня і скаргаў. Заслухаць праз тры месяцы даклад НК РСІ аб выніках гэтае праверкі.

3. Прапанаваць АВК, РВК і Саветам БССР зьвярнуць больш увагі на вырашэньне скарг і хадайнічаньняў працоўнага насельніцтва мясцовымі органамі ўлады і ўстановамі, з мэтаю разгрузкі ЦВК ад такіх спраў, якія можна і павінна вырашаць канчаткова на мясцох.

4. Лічыць неабходным заслухаць даклады двух АВК і РВК аб выкананьні імі дырэктыў Прэзыдыуму ЦВК у справе прыёму і абслугоўваньня наведвальнікаў і вырашэньня іх скарг і хадайніцтваў.

ВЫК. АБ. СТАРШЫНІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
А. Хацкевіч.

ЗА САКРАТАРА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
У. Ігнатоўскі.

17-га кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

Пастанова Эканамічнае Нарады БССР

ПРА ЎСТАНАЎЛЕНЬНЕ СТАВАК ЗАПЛАТЫ ЗА ПАДВОЗ У ПАРАДКУ ГУЖАВОЙ ПАВІННАСЬЦІ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ ДА МЕСЦ ПАГРУЗКІ І ЗА ПАГРУЗКУ І ВЫГРУЗКУ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ Ў ПАРАДКУ ПРАЦОЎНАЙ ПАВІННАСЬЦІ.

Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя стаўкі аплаты за падвоз у парадку гужавой павіннасьці хлеба і бульбы да месц нагрузкі:

за падвоз на адлегласьць ад	1 да 3	кілёмэтраў	— 9 к.	за цэнтн.
„ „ „ „ „	3 „ 5	„	—24 „	„ „
„ „ „ „ „	5 „ 10	„	—30 „	„ „
„ „ „ „ „	10 „ 15	„	—48 „	„ „
„ „ „ „ „	15 „ 20	„	—60 „	„ „
„ „ „ „ „	20 „ 25	„	—72 „	„ „
„ „ „ „ „	25 „ 30	„	—78 „	„ „

За падвоз на адлегласьць больш 30 кілёмэтраў па 6 кап. за цэнтнэра за кожныя 5 кілёмэтраў.

2. Устанавіць за пагрузку і выгрузку хлеба і бульбы ў парадку працоўнай павіннасьці плату 1 р. 50 кап. за 8-гадзінны рабочы дзень.

Старшыня Эканамічнай Нарады БССР М. Каркліп.
Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Л. Дубавіцкі

27 кастрычніка 1929 г. гор. Менск.

Рахункаводзтва ў калгасы.

Дасьледуючы калгасы ў раёнах БССР (у Клімавіцкім — 12 і Чэрыкаўскім—4), я зьвярнуў увагу на хваравітае месца працы, якое як мага хутчэй трэба выправіць. Хваробнае тое, што ва ўсіх калгасах адсутнічае рахункаводзтва, калі ня лічыць так званага „хатняга рахункаводзтва“ сустракаўшагася ў двух калгасах Клімавіцкага раёну і адным калгасе Чэрыкаўскага раёну. У мяне зрабілася ўражаньне, што на гэту галіну працы калгасы ня толькі не зьвяртаюць належнай увагі, а нават не разумеюць ролі і значаньня рахункаводзтва ў буйнай гаспадарцы.

Рахункаводзтва трэба гаспадарцы таму, каб яна мела магчымасьць рацыянальна (найбольш карысна ў данных умовах) пабудаваць сваю вытворчасьць. Каб усебакова і па ўсіх галінах бачыць, што ў гаспадарцы дае карысьць, а што дае страту і каб стратныя галіны зьнішчаць за рахунак пашырэньня больш каштоўных галін. Мы бачым, што амаль ва ўсіх калгасах існуюць такія галіны гаспадаркі, якія не толькі не даюць прыбытку, а нават зьяўляюцца стратнымі. Гэтыя стратныя галіны існуюць у гаспадарцы за рахунак прыбытку з іншых галін і, такім чынам, гаспадарка паволі зьяўляецца малапрыбытковай. Чаму гэта так? А таму, што гаспадарка вядзецца па старынцы, у гаспадарцы няма гаспадарчага разьліку.

А каб калгас вёў рахункаводзтва, і хоць па самай простай форме адчыніў лікавыя рахункі па асобным галінам гаспадаркі: жыту, аўсу, бульбе, лёну, прадукцыйнай жывёле, працоўнай жывёле і г. д. і на левай старонцы кнігі „дэбет“ запісаў усё тое, што жыта ці прадукцыйная жывёла атрымала ад гаспадаркі, а на правай старонцы «крэдыт» запісаў, што яно дало гаспадарцы, то гэты запіс даў-бы магчымасьць у канцы апэрацыйнага году падлічыць усе выдаткі і прыбыткі ад кожнай паасобнай галіны і, такім чынам, выявіць, якія з галін гаспадаркі зьяўляюцца прыбытковымі ці стратнымі. Урэшце ўпэўніўшыся ў выніках стратнасьці тэй ці іншай галіны, —ці дапусьціла праўленьне калгасу далейшыя памылкі.

Калгасаюзам выпрацаваны формы рахункаводзтва і, па маёй думцы, ня дрэнныя. Толькі, на жаль, што кніжкі ў калгасах ляжаць чыстыя і іх ніхто не вядзе.

Час праўленьням калгасаў і агранамам-калгасьнікам на гэту справу зьвярнуць увагу,

Сумесна з гэтым паўстае пытаньне, якім чынам наладзіць рахункаводзтва ў калгасах.

Па маёй думцы, належным органам трэба:

1) выявіць у кожным калгасе па аднаму здольнаму таварышу, з якім правесьці курсы па сельска-гаспадарчаму рахункаводзтву,

2) арганізаваць кароткa-тэрміновыя курсы па сельска-гаспадарчаму рахункаводзтву для падрыхтоўкі добра кваліфікаваных працаўнікоў;

3) увесьці інстытут рахункаводаў-інструктароў па аднаму на кожны куст (5-6 калгасаў), якія-б шляхам плянавага аб'езду калгасаў куста кіравалі-б рахункавай працай.

Апошнія мерапрыёмства, як утрыманьне некалькімі калгасамі рахункавода-інструктара, вядома будзе выклікаць некаторыя выдаткі з боку калгасаў, але дзякуючы слабай кваліфікацыі рахункаводаў на мясцох, без чалавека добра знаёмага са справай, які-б пільна сачыў за рахункаводзтвам, а ў цяжкіх выпадках дапамагаў-бы ў працы, абыйсьціся нельга.

Трэба памятаць, што ў далейшым, у сувязі з узбуйненьнем калгасаў, так ці інакш трэба будзе мець сталых рахункаводаў, бо бяз вучоту нельга будаваць сацыялістычнае гаспадаркі.

М. Эрдман.

Што перашкаджае разьвіцьцю мясазагатовак.

Можна загатовіць дзесяткі тысяч пуд. мяса, але няма куды яго дзець. „Дробязі“, на якія Наркамгандлю трэба зьвярнуць належную ўвагу.

Увосені наша сялянства звычайна збывае тую жывёлу, якую ня думаюць далей трымаць. У зьвязку з гэтым у гэты пэрыяд на базарах паяўляюцца значныя гурты прадажнай рагатай скаціны.

Тое самае назіраецца і сёлета. Аднак, ці падрыхтаваліся адпаведныя арганізацыі да гэтай важнай кампаніі? Трэба сказаць, што ня зусім. Мы зараз знаходзімся перад такім становішчам, калі ёсьць гурты закупленай гавяды, але нельга рэзаць, бо няма куды дзець мяса. Прынамсі, так абстаіць справа па лініі малочна-жывёлаводнага саюзу, які мог-бы зараз загатовіць да 25.000 пуд. мяса, але які стаіць перад пагрозаю, што мяса папсуецца. На менскім халадзільніку вольнага месца ня маецца. Своечасова ня былі прыняты меры, каб скончыць да гэтага часу будаўніцтва халадзільніка ў Воршы, які ня хутка будзе яшчэ збудаваны. Зараз стварылася такое дзікае становішча, калі малочна-жывёлаводны саюз прымушаны зьмяшчаць загатоўленае мяса на Смаленскім халадзільніку. Колькі-ж павінны каштаваць непатрэбныя накладныя выдаткі на адпраўку ў Смаленск і прывоз назад 10.000 пуд мяса? Зусім слушна, што гэтыя атрады будзе несьці кішэнь спажыўца.

Тым часам такія замінкі адбіваюцца на тэмпе загатовак. Спыняецца ці ў лепшым выпадку затрымоўваецца закупка скаціны. А калі зараз паслабіць апэрацыі па закупцы жывёлы—гэта значыць прапусьціць увесь загатоўчы сэзон. Апрача гэтага, каапэрацыя мае вялікія страты ад лішняга ўтрыманьня жывёлы. Нядаўна нават быў такі выпадак, калі з Бабруйску адправілі ў Менск цэлы гурт кароў, але мусілі варочацца з дарогі назад, бо з Менску тэлеграфавалі, што няма куды дзець мяса. Гэты факт сьведчыць аб тым, што ў нас нешта кульгае ў справе загатовак мяса.

Яшчэ адзін характэрны факт, які падкрэсьлівае нячутнасьць нашага апарату, а часам нават і наяўнасьць мёртвага фармалізму. Белсельбанк адмаўляе Мазырскаму малочна-жывёлаводнаму саюзу ў павялічэньні крэдытаў на васеньні пэрыяд звыш тых лімітаў, якія вызначаны па-квартальна. А для Мазырскай акругі, акругі пераважна жывёлаводнай,—гэта ёсьць пэўнае абмежаваньне тых магчымасьцяў, якія маюцца ў галіне мясазагатовак. З другога боку, адсутнасьць мажлівасьці адразу рэалізаваць мясныя прадукты, як скуры, мяса і інш. становіць мясазагатоўчыя арганізацыі ў вельмі напружанае фінансавае становішча.

Мы сустракаемся часам нават з такім становішчам, калі сам Наркамгандаль уважліва не адносіцца да мясных загатовак. Хоць-бы узяць прыклад з пытаньнем арганізацыі адкормачных пунктаў для сьвіней па лініі малочнай каапэрацыі. Павінна быць адкормлена 2 тыс. штук сьвіней. У некаторых округах да гэтага часу ня прыступілі да адкорму, бо Наркамгандаль не зацьвердзіў крэдыты, а бяз гэтага яны ня могуць пераводзіцца на месцы.

Пры нашым крызісе на мяса загатоўка птушак, асабліва курэй, павінна адыграць вельмі вялікую ролю. Трэба канстатаваць, што і ў гэтай галіне ў нас мала што зроблена. Нашы ЦРК ня ўсюды падрыхтаваліся да прыёму загатоўленай курацыны. Такі выпадак быў з Бабруйскім ЦРК. З гэтае прычыны Дзяржгандаль адмаўляецца заключыць дагавор на загатоўку курэй.

З усяго гэтага трэба зрабіць належны вывад, што ў нас невыстарчальна падрыхтаваліся да мясных загатовак, гэтай кампаніі адводзіцца ня досыць увагі з боку рэгулюючых органаў.

Трэба так паставіць справу, каб менскі халадзільнік нагрузіць да адказу. І, урэшце, наш ЦРК павінны пасіліць працу з забесьпячэньнем спажыўца курацінай.

ХРОНІКА.

Больш увагі загатоўцы хлебапрадуктаў.

За 20 дзён кастрычніка па БССР розных хлебапрадуктаў загатоўлена каля 20 тысяч тон, а за ўвесь час кампаніі на гэты тэрмін загатоўка складае каля 31.000 тон. Такім чынам месячнае заданьне выкана за дзьве дэкады кастрычніка на 80 пр. і гадавы плян выканан на 54 проц. За апошнюю пяцідзёўку кастрычніка паступіла звыш 7.000 тон.

Гэты тэмп трэба замацаваць і не дапусьціць яго зьніжэньня, тады можна будзе поўнасьцю выканаць увесь гадавы хлебазагатоўчы плян у вызначаны тэрмін.

Неабходна адзначыць, што за першыя 10 дзен кастрычніка ў параўнаньні з верасьнем такія важныя хлебазагатоўчыя акругі, як Бабруйшчына, Магілеўшчына і Меншчына моцна зьнізілі ўдзельную вагу жыта і пшаніцы ў сялянскіх загатоўках. Так, у Бабруйшчыне ў верасьні загатоўкі жыта і пшаніцы складалі 76 проц. агульнай колькасьці зернавых культур, а за 10 дзён кастрычніка ўжо толькі 62 проц. У Магілеўшчыне гэты процант зьнізіўся з 51 да 49 і ў Меншчыне з 78 проц. у верасьні да 68 проц. за першую дэкаду кастрычніка. У выніку гэтага мы маем агульнае зьніжэньне ўдзельнай вагі жыта і пшаніцы ў загатоўках з 59 проц. да 49,3 проц.

Такое становішча тлумачыцца тым, што кулацкія гаспадаркі здаюць менш каштоўныя зернавыя культуры, а на мясцох на гэта не зьвяртаюць належнай увагі.

Плянава наладзіць перавозкі хлеба.

Прэзыдыум ЦП саюзу транспартнікаў абгаварыў пытаньне аб становішчы хлеба-грузаперавозак.

З матар'ялаў відаць, што адсутнічае плянавасьць у хлебаперавозках. Дзяржаўны транспарт ня выконвае ўсё заданьні па хлебаперавозках, у выніку прыватнікі значна ўздымаюць цэны на пагрузачныя і перавозныя работы.

Ёсьць выпадкі, калі Саюзхлеб самавольна павялічвае некаторым групам рабочых плату за пагрузачныя працы.

На ст. Менск няма абсталяваньня і 2-ой зьмене трэба працаваць пры поўнай цемнаце.

Ня гледзячы на тое, што УМТ'у адпушчана 10 тысяч рублёў на папаўненьне транспарту, у хлебаперавозках наглядаецца шмат перабояў.

У лістападзе м-цы чакаецца асаблівае ўзмацненьне хлебаперавозак, а між тым транспарт не падрыхтаваны да гэтага. Аўтакіраўніцтва абяцала даць 5 грузавікоў, але гэта па сёнешні дзень ня выканана.

Прыватнік дыктуе цэны на перавозкі. З 57 коняў дзяржаўнага транспарту на хлебаперавозках выкарыстоўваюцца толькі 30.

Як устаноўлена, становішча з перавозкаю хлеба яшчэ горш у акругах (Віцебск, Магілеў, Ворша) дзе дзяржаўны транспарт працуе зусім кепска.

Прэзыдыум ЦП адзначыў, што з боку Менсельпрому і Акрвыканкому нічога ня робіцца ў справе мэханізацыі транспарту.

Саюзам выпрацаваны мерапрыёмствы на палепшэньні транспартных перавозак.

* * *

У мэтах змякчэньня недахопу ў складзкіх памяшканьнях урадавая камісія запрапанавала Барысаўскаму райвыканкому неадкладна пачаць пабудову складу на 70 тысяч пудоў хлеба для Саюзхлебу. Побач з гэтым запрапанавана Лесбелу прыняць тэрміновыя меры да пабудовы складу на 300 тысяч пудоў хлеба. Будаўніцтва павінна Лесбелам быць скончана не пазьней 20 лістапада.

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі Клімавіцкага раёну.

У зьвязку з шырокім разгортваньнем калектывізацыі сельскай гаспадаркі Клімавіцкага раёну Белкалгассаюз пастанавіў правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыёмствы:

Дазволіць Клімавіцкаму РВК падабраць 10 кіраўнікоў для буйнейшых калгасаў раёну. Першае паўгодзьдзе кіраўнікі будуць утрымоўвацца за кош Белкалгассаюзу. Дзеля гэтай мэты ў Магілеў пераводзіцца на 1-ы квартал 3000 руб.

Дзеля падрыхтоўкі патрэбных кадраў ва ўсіх галінах гаспадаркі са складу актыву калгасаў у Клімавічах арганізуюцца сталыя курсы. Апошнія будуць рабіць па 4 выпускі ў год.

Клімавіцкі РВК супольна з Наркамземам павінен не ў забаве падабраць агранома ў для папаўненьня аграсеткі.

Для лепшага абслугоўваньня калгасаў у Клімавіцкім раёне арганізуецца райкалгассаюз.

У гэтым раёне пастаноўлена пабудаваць буйны мэханізаваны маслосыраробчы завод.

Белкалгассаюз падымае пытаньне перад Беларускім Урадам аб пасылцы ў гэты раён аўтарытэтнай камісіі для вывучэньня і намёткі шляхоў разьвіцьця прамысловага будаўніцтва і аб водпуску спэцыяльных сродкаў для Клімаўшчыны.

Да ўсебеларускага зьезду прафсаюзаў.

У пачатку 1930 году склікаецца ўсебеларускі зьезд прафсаюзаў БССР. Арганізацыя ЦСПСБ даў дырэктыву ўсім ЦП і Акрпрофбюро аб падрыхтоўцы адпаведнага матар'ялу да зьезду.

Забесьпячэньне дэфіцытнымі таварамі рабочых савгасаў.

У мэтах лепшага забесьпячэньня дэфіцытнымі таварамі рабочых савгасаў, прэзыдыум саюзу с.-г. і лясных рабочых узьняў пытаньне аб прымацаваньні савгасаў да бліжэйшых крам ЦРК. Саюз выказаўся за водпуск крэдытаваньня рабочым савгасаў.

У Менску будзе пабудавана фабрыка футраў.

Белдзяржгандаль распачынае падрыхтоўку да будаўніцтва ў Менску буйнай фабрыкі футраў, якая будзе каштаваць да 400.000 руб. Будаўніцтва павінна быць скончана да наступнай восені.

Фабрыка будзе выпускаць коцік, апрацоўваць скуры лісаў, выдраў. Пад коцік будуць ужывацца скуры сабак, кошак і трусоў. Дзеля пашырэньня гадоўлі трусоў будзе праводзіцца кантрактацыя іх.

Фабрыка будзе абсталявана па апошняму слову тэхнікі.

Дадатковая падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Работніцы і жонкі рабочых Гандзьбуду падпісаліся дадаткова на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 320 руб. і выклікаюць узяць з іх прыклад усіх жонкам рабочых будаўнікоў г. Менску.

Новы калектыў „сіняя блуза“.

Пры ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых арганізаваны замест вандроўнага тэатру калектыў „сіняя блуза“.

Калектыў дасьць свае першыя выступленьні ў дні кастрычнікавых сьвят і будзе галоўным чынам абслугоўваць раённыя цэнтры і вёскі.

Арганізацыя баз тары.

У мэтах лепшага манэўраваньня наяўнай тарай Беларуская кантора Саюзхлеба ўтварае 3 раённыя базы тары ў Менску, Віцебску і Гомелі, да якіх далучаны бліжэйшыя акругі.

Пасьля арганізацыі баз адпадае патрэба ў складах тары пры кожнай арганізацыі, бо ўсе мяшкі каапэрацыі і прамысловакі будуць накіроўвацца на гэтыя базы для рамонту і сартыроўкі.

Загатоўкі семя лёну.

Да 25 кастрычніка па ўсёй БССР месячны плян па загатоўцы семя лёну выканан на 66,8 проц., а за ўвесь час кампаніі гадавы плян выканан ужо на 71,2 процантаў.

БУЛЬБА З ЧАЧЭРСКУ ГРУЗІЦЦА.

У Наркамгандлю атрымана з Кіеву тэлеграма, што Дзяржпараходзтва ў Чачэрск, дзе чакае пагрузкі 75.000 пудоў бульбы, пададзена баржа на 45 тысяч пудоў. Прыняты меры і да падачы другой баржы.

Добры пачын.

Клясавы вораг часта выступае супроць беларусізацыі, апранаючы сябе ў адзеньне шавінізму і нацыял-дэмакратызму розных масьцей і адценьняў.

Яўрэйская газэта „Акцябр“ распачала на сваіх старонках кампанію за паглыбленьне беларусізацыі [illegible], у прыватнасьці сярод яўрэйскіх працоўных мас.

— Нацыянал-дэмакратызм узогуле, —зазначана ва ўступным артыкуле „Акцябра“ ад 30 кастрычніка г. г., „Вывучайце беларускую мову“,—сваёй барацьбой супроць беларусізацыі вядзе барацьбу супроць дыктатуры пралетарыяту.

— Чым адказвае пралетарыят на гэта?

— Узмоцніць беларусізацыю, клапаціцца аб тым, каб усе працоўныя ведалі беларускую мову. Гэта дапаможа ўзмацненьню кіраўніцтва пралетарыяту сялянствам, што зьяўляецца пэўным момантам у барацьбе за пралетарскую дыктатуру.

Беларусізацыя дае магчымасьці і пралетарыяту кіраваць [illegible] ным будаўніцтвам краіны [illegible] ненасьці [illegible] у тым, што кулацтва служыць інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва.

Вось чаму мы зварачаемся з клікам да ўсіх яўрэйскіх працоўных мас.

Вывучайце беларускую мову! Беларусізацыя—струмант для [illegible] нага наступу.

Каб даць магчымасьць [illegible] працоўным масам лягчэй [illegible] ларускай мовай, на старонках „Акцябр'а“ будуць сыстэматычна вацца спэцыяльныя лекцыі.

Першая лекцыя пачынаецца [illegible] каваньня па-беларуску [illegible] тэма (інтэрнацыянал).

Трэба вітаць добры пачын „Акцябр'а“.

Прэміруюць гарэлкаю.

Адміністрацыя менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу робіць справаздачу. На парадку дня—хлебазагатоўкі, падрыхтаванасьць да працы, што зрабіла менскае аддзяленьне ў галіне ўзмацненьня хлебазагатовак.

— У нас усё добра, у нас мяшкі перапоўнены зярном, няма куды дзяваць.

— А на райёне, як стаіць справа?—пытаецца нехта нясьмела.

— На райёне, ну няхай адміністратары на райёне і клапоцяцца, нам няма часу займацца з райёнамі.

Адказ адміністрацыі менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу не спадабаўся агульнаму сходу, і тут то выкрыліся вялікія кур'ёзы, значныя выкрыўленьні ў працы менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу.

— А ці ведаеце вы, пачалі сыпацца пытаньні,—што ў некаторых пунктах Менскага райёну здатчыкаў хлеба зусім не прэміравалі, сарвалі здачу, а за тое некаторыя вельмі пастараліся і прэміравалі... гарэлкаю.

Гэтая заява ўскалыхнула яшчэ больш сход, які вылявіў цэлы памылак у працы менскага аддзяленьня БКС. Аказваецца, што адміністрацыі БКС ня было [illegible] заньняў і інструкцый мясцовым [illegible] карысталіся кулакі, якія, [illegible] не павялічвалі загатоўкі, а [illegible] рот, зрывалі іх.

І яшчэ раз прыходзіцца з [illegible] часьцю паставіць пытаньне [illegible] ку пізавых праф'ячэек [illegible] цікаўленасьці ў працы па [illegible] тоўках. Досыць зазначыць, [illegible] равітае зьявішча, як [illegible] гарэлкай, прашло зусім [illegible] мясцкому менскага аддзяленьня [illegible] казаасаюзу.

Ну, а ЦП саюзу, што яно [illegible] Роўным чынам нічога, яно [illegible] на сваёй пізавой ячэйцы і [illegible] адносіне і нават ня цікавіцца [illegible] апошніх дзён, як абстаіць [illegible] хлебазагатоўкамі ў Менскай [illegible] працы мясцком, эканомка [illegible] настаноўкі гэтай справы на [illegible] вышыню.

Член сельсавету—п'яніца і самагонщык.

Член Маковіцкага сельсавету, Глускага раёну, Бабруйскай акругі Калінкін увесь час п'янствуе і гоніць самагонку. Напіўшыся, ён б'е сваю жонку і дзяцей.

Грэ Калінкін зьяўляецца [illegible] ным прыкладам для іншых [illegible] савету і ўсіх грамадзян.

Справачны аддзел.

КАТЫРОУКА ПАЗЫК

на 31 кастрычніка 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.98,5	—
Бясспроц. выйгр. паз. 26 г.	120.50	130.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.75	101.15
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.50	25.60
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.04,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.36	25.46
2 „ „ „ проц.	25.45,5	25.55.5
2 „ „ „ 6-проц.	25.45,5	25.55,5
11 проц. дз. паз. 1928 г.	101.87	101.92
12 пр. рэнта. паз. 1927 г.	104.96	—

Дом Камасьветы імя Маркса.

Пры Доме Камасьветы [illegible] наступныя гурткі падвышанага [illegible] актыву:

1. Па вывучэньню аграрнае [illegible] аграрнай палітыкі.

2. Па вывучэньню нацыянальнае [illegible] блемы і нацыянальнай палітыкі.

3. Гурток для партактыву [illegible] чых установ на тэму — МАЛЫ ПРАВА.

5. Па вывучэньню гісторыі [illegible] клясавага змаганьня на Беларусі.

Запіс у гурткі ўтвараецца ў [illegible] асьветы штодня ад 12 да 3 [illegible] 6 гадз. увечары.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

У нядзелю, 3-га лістапада а 6-ай гадзіны ўвечары ў клюбе [illegible]
(Ленінская, 13, уваход з двара)
АДБУДЗЕЦЦА АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД РАБКОЎ
УСІХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І НАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТ Г. МЕНСКА
АБВЕСТКА ДНЮ: 1. Колдагаворная кампанія і ўдзел рабочых.
2. Аб шырокай рэдкалегіі газ. „Рабочы [illegible]
Білеты разасланы па прадпрыёмствам. Запрашаюцца працаўнікі [illegible] вага друку, ЦСПСБ, РСІ, пракуратуры і міліцыі.
Масавы аддзел газ. „Рабочы [illegible]

Дана асобнага нумару 5 кап.
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
БЕЛАРУСКАЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА
ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА
ЛІСТАПАД
і далейшыя тэрміны.
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 мес.—90 кап. 6 мес.—4 руб.
3 мес. 2 р. 70 кап. год — 8 руб.
АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
на 1930 г.
Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі кантор агэнцтва друку і канторай газэты (Менск 2-гі Дом Саветаў)
СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.
З панядзелка 28 кастрычніка
„РАЗЛОМ“
Звыш праграмы: кіно-хроніка № 56.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
З панядзелка 28 кастрычніка
мастацкі фільм
„Як часам бывае“
драма ў 6 частках.
Звыш праграмы: Хроніка савкіно № 58.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.
З панядзелка 28 кастрычніка
„ЛЯСНЫЯ ЛЮДЗІ“
Краязнаўчы нарыс у 5 частках.
Звыш праграмы: Кіно-хроніка „СОВКІНО“.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“
З панядзелка 28 кастрычніка
НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ
„ГОРНАЯ БАЛЯДА“
у 7-мі ЧАСТКАХ.
Пачатак а 7 гадзіне.

Да ведама падпісчыкаў.

Кантора газэты „Савецкая Беларусь“ апавяшчае,

што з прычыны ліквідацыі Беларускага аддзяленьня выдавецтва „Известий ЦИК СССР“ з 1-га лістапада выдача газэт падпісчыкам па гарадзкому аддзелу будзе праводзіцца непасрэдна з канторы газэты (Рог вул. К.-Маркса і Ленінскай, 2-гі дом саветаў).

Кантора адчынена з 9 да 15 з пал. гадз.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пашпарт Сьлепяна З. С., выд. Менакрміліц., кв. 1.

— Сяброўская кніжка Прус Р. Е., выд. саюзам савгандальслужачых, кв. 2.

— Беспрацоўная кніжка № 1342 Любова Р. А., выд. Менакрстрахкасай, кв. 3.

— Пасьведчаньне нарвіда Віткоўскай М. А., выд. Астрашн.-Гарадзецкім РВК, кв. 4.

— Кніжка № 2268 Гржэлеўскага С. В., выд. Кустпрамкрэдытам, кв. 14.

— Пашпарт № 2471 Аўчыньнікавай А. Я., выд. Менакрміліц., кв. 6.

— Сяброўская кніжка Казюніц К. В., выд. ЦП саюзу працасьветы, кв. 7.

— Сяброўская кніжка № 1767 Шамко Е. М., выд. саюзам харчавікоў, кв. 9.

— Беспрацоўная кніжка № 2793-17669 Шамко Е. М., выд. Менакрстрахкасай, кв. 10.

— Біржавы талён № 7748 Буднікава Ф. Н., выд. Менбіржай працы, кв. 11.

— 1) Чырвонаарм. кніжка, выд. Халопен.цк. РВК 2) асабовае пасьведчаньне, выд. Барысаўск. калгасн. 3) копія пасьведчаньня аб скончэньні II ступ. на імя Рапапорт кв. 708п.

— Асабовае пасьведчаньне за № 817 Верхаводка І., выд. Каршакоўск. с-сав., кв. 709п.

— Сяброўская кніжка № 1758 Зюлька Е. С., выд. аршанск. аддз. саюзу асьветы, кв. 32п.

— Пашпарт Гафта С., выд. Мсьціслаўскім РВК, кв. 33п.

— Сяброўскі білет № 3052 Аўдусіна І. Н., выд. Мазырск. акр. аддз. саюзу с.-г. і лясных рабоч. на імя Аўдусіна І. Н., кв. 34п.

— Сяброўская кніжка № 930 Гофштэйна А. С., выд. Мазырскім саюзам дрэваапрац., кв. 35п.

— Пашпарт Кауфман Г. А., выд. Чэрвенскай міліц., кв. 36п.

— Вайсковая кніжка Серакава Н., выд. Мсьціслаўскім райвайсковым сталом, кв. 37п.

— Пячатка Талочынскага раённага к-та ўзаемадапамогі Аршанск. акр., кв. 38п.

— Квіт, выд. Гарэцкай фінаддз. аб унесьені ў касу 2-й пазыкі індустр. на суму 25 руб. на імя Стакло В., кв. 39п.

— Вайсковая кніжка аб зьнятьці з вучоту, выд. Гарэцкім РВК у 1928 годзе на імя Шупіла С., кв. 39п.

— Вайсковая кніжка Даўжанкова І., выд. Гарэцкім ваенкомам у 1918 г., кв. 39п.

— Асабовае пасьведчаньне Касянка І. Ф., выд. Суражскім РВК, кв. 13.

Галоўлітбел 535.
Друкарня БДВ.